РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЖНІЎНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 165 (30553)



# НАТАТКІ МАЛАДОГА ЎРАЧА. ГОД 2025

**Адразу пасля вучобы яго прызначылі загадчыкам вясковай амбулаторыі. Ён справіўся і не шкадуе аб выбраным шляху**

Маладыя спецыялісты па ўсёй краіне пачалі работу. Наперадзе іх чакае цікавы шлях. А мы сустрэліся з маладым чалавекам, які пра гэты шлях ужо мае што расказаць. Знаёмцеся: Вадзім Краўцэвіч, загадчык Мажэйкаўскай амбулаторыі ў Лідскім раёне. Вучыўся ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце па мэтавым накіраванні ад Лідскай ЦРБ. Прыехаў у амбулаторыю па размеркаванні, адразу загадчыкам. За яго плячыма — чатыры гады адпрацоўкі. Пагаварылі з маладым урачом аб яго рабоце і планах на будучыню.

СТАР. 13

НОВЫЯ РЭКОРДЫ ЖНІВА 8-9




БАДай, НЕ ПАШКОДЗІЦЬ 14-15



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25165

НАПЯРЭДАДНІ

## КНІЖНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА — ШЫРОКАЯ

**XXXII Дзень беларускага пісьменства больш прадставіць рэгіёны**

Лідчане рыхтуюцца прымаць гасцей з усёй Беларусі і не толькі: 6 і 7 верасня ў горад завітае галоўнае свята асветы. Арганізатары імкнуцца падкрэсліць: кніга — гэта і ёсць свята, якое можа прыйсці ў кожны дом. І пры жаданні — у любы момант, бо мэта якраз у тым, каб жыхары Беларусі працягвалі традыцыю — жыць з кнігай, якая прыйшла на нашу зямлю больш за палову тысячагоддзя таму.

Гэта тэма ўключана ў сёлетнюю канцэпцыю свята разам з тэмамі 80-годдзя Перамогі і Года добраўпарадкавання, святкаваннем юбілейных дат класікаў айчыннай літаратуры. І ўсё ж асаблівы акцэнт — у Лідзе! — на старажытнасці: 500 гадоў з моманту першай публікацыі кнігі «Апостал» Францыска Скарыны. Гэта тэма будзе чырвонай ніццю праходзіць на большай частцы пляцовак, падкрэсліў намеснік міністра інфармацыі Дзяніс ЕЗЕРСКІ, як знак адданасці традыцыям Скарыны.




СТАР. 10–11

# «МОЦНАЯ ЭКАНОМІКА ПАЧЫНАЕЦЦА

## Эксперты — аб эфектыўнасці сістэмы

У аўторак, 26 жніўня, у Палацы Незалежнасці на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі абмяркоўвалі пытанні, якія ўплываюць на ўзровень і якасць жыцця людзей. Цэнтральнай тэмай нарады значылася эфектыўнасць сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў маштабах краіны, перш за ўсё ў сельскай мясцовасці. Нашы эксперты пракаментавалі нараду ў кіраўніка дзяржавы.

### «ПРЭЗІДЭНТ ЗАЎСЁДЫ З КЛОПАТАМ СТАВІЦЦА ДА СЕЛЬСКІХ ЖЫХАРОЎ»

«Клопат аб людзях і іх дабрабыце павінен быць галоўнай мэтай любога кіраўніка», — нагадала фразу, сказаную Прэзідэнтам практычна паўтара дзясятка гадоў таму, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Ірына ДАЎГАЛА**. Па словах дэпутата, гэты пасыл гучаў з новым напаўненнем і на нядаўняй нарадзе.



«Мы ўсе пакупнікі (не важна, рэальныя або віртуальныя) і хочам набыць любыя тавары і паслугі хутка, якасна, з добрым выбарам і па даступнай цане, — лічыць парламентарый. — Сёння гараджанам не трэба скардзіцца на адсутнасць пэўных тавараў або паслуг. Шырокі асартымент, цэнавы дыяпазон, крокавая даступнасць — адным словам, бяры — не хачу. А вось жыхары сельскай мясцовасці не заўсёды і не ўсюды могуць пра гэта з упэўненасцю гаварыць. Калі аўтакрама і прыязджае, то асартымент небагаты ды і цэннік замоблачны. Многія працуюць па так званым заяўным прынцыпе: збіраюць заяўкі ад жыхароў і, адпаведна, прывозяць іх замовы. Так і людзям добра, і рэалізацыя тавараў у гандлёвай арганізацыі ідзе».

Самым затратным у гэтым плане, па словах дэпутата, з'яўляецца транспартнае забеспячэнне. «Вядома ж, дзяржава не можа проста даць сродкі на пакрыццё транспартных страт, таму Прэзідэнт і настойвае, каб гэта былі крэдытныя сродкі, — заўважыла Ірына Даўгала. — Сеткавыя супермаркеты, якія літаральна аваладалі гандлёвай прасторай краіны, адчуваюць сябе выдатна. Таму абсалютна абгрунтаванае патрабаванне нашага Прэзідэнта, каб яны неслі сацыяльную нагрузку».

Парламентарый звярнула ўвагу на тое, што пры правядзенні маніторынгу цэн (а гэта ўжо неад'емная частка работы дэпутатаў) устаноўлены факты, калі ў шэрагу тых жа супермаркетаў, як кажуць пакупнікі, «касмічныя» цэны на дурніцы, клубніцы, маліны (кошт у дыяпазоне 60—115 рублёў), на абрыкосы — 83 рублі, персікі — 67 рублёў. А цяпер, калі ўжо ёсць ураджай сваіх яблыкаў, на прылаўках — польская садавіна.

Усё гэта, як падкрэслівае намеснік старшыні Пастаяннай камісіі, выклікае ўстойлівую незадаволенасць сярод пакупнікоў. Асабліва сярод пенсіянераў, людзей сярэдняга дастатку, шматдзетных і маламаёмасных. «Таму ўсім (і рэспубліканскім, і мясцовым органам улады) кіраўнік дзяржавы паставіў канкрэтную задачу: патрэбна эфектыўная сістэма абслугоўвання ў маштабах краіны, — канстатавала дэпутат. — Прэзідэнт заўсёды з клопатам ставіцца да сельскіх жыхароў, бо ў першую чаргу дзякуючы менавіта ім забяспечваецца ў нашай краіне харчовая бяспека. І каго, як не іх, неабходна забяспечыць усім. У нашага Прэзідэнта словы не разыходзяцца са справай, і калі асновай асноў з'яўляецца сацыяльная справядлівасць, то яе забеспячэнне — ключавая задача. А сацыяльная справядлівасць для сельскіх жыхароў — гэта і ёсць сацыяльная абароненасць».

### РАЗМОВА АБ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ НАШЫХ ГРАМАДЗЯН — У КОЖНЫМ КУТКУ КРАІНЫ

— Чарговая нарада ў Прэзідэнта зноў пацвердзіла простую, але фундаментальную ісціну: моцная эканоміка пачынаецца з клопату пра чалавека, — у сваю чаргу звяртае ўвагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна ІГНАЦЮК**. — Пытанне, якое ўзняў Аляксандр Рыгоравіч, далёка не толькі аб гандлі. Гаворка пра якасць жыцця нашых грамадзян — у кожным, нават самым аддаленым, кутку краіны.



Сенатар звяртае ўвагу на важнасць разумення таго, што гандлёвае абслугоўванне — гэта не проста паліцы з таварамі, гэта аблічча дзяржавы, яе стаўленне да людзей:

— І гэта аблічча павінна быць добразычлівым, сучасным і даступным.

Асаблівую важнасць, на яе думку, набывае даручэнне аб стварэнні адзінай эфектыўнай сістэмы гандлёвага абслугоўвання па ўсёй краіне, уключаючы сельскія населеныя пункты:

— Гэта пытанне сацыяльнай справядлівасці і тэрытарыяльнай цэласнасці, мудры і своечасовы курс на павышэнне якасці жыцця. Бо ў рэшце рэшт эфектыўная сістэма гандлю — не толькі пра тое, што і дзе прадаецца. Наша дзяржава, як руплівы гаспадар, адчувае клопат аб кожнай сям'і, дзе б яна ні жыла.

Парламентарый заклікае:

— Давайце разам увасобім гэты клопат у рэальныя справы. Ад нас з вамі залежыць, каб ужо ў новым годзе па прадукты быў не доўгі шлях, а кароткая і прыемная дарога да якасці і дабрабыту.

### «УСЕ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ КАМФОРТНА І МЕЦЬ АДНОЛЬКАВУЮ МАГЧЫМАСЦЬ КУПЛЯЦЬ ПРАДУКТЫ І ТАВАРЫ»

Як звяртае ўвагу **член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Алена ПАРХІМЧЫК**, з'яўляючыся народным Прэзідэнтам, Аляксандр Лукашэнка на нарадах заўсёды ўзнімае актуальныя тэмы, якія маюць вялікае значэнне для кожнага жыхара краіны.



«У Беларусі вельмі шмат робіцца для таго, каб людзі, якія працуюць у рэальным сектары эканомікі, мелі дастойны ўзровень жыцця і ўсё неабходнае, — перакanана дэпутат. — Не мае значэння, працуе чалавек у горадзе або забяспечвае харчовую бяспеку краіны, апрацоўваючы зямлю і вырошчваючы сельскагаспадарчых жывёл, — усе павінны жыць камфортна і мець аднолькавую магчымасць купляць прадукты і тавары. З гэтым пасылам кіраўнік дзяржавы неаднаразова звяртаўся да ўрада і ўсіх зацікаўленых службаў і ведамстваў. Таму тэмы гандлю і іншыя, якія абмяркоўваліся ў Палацы Незалежнасці, не новыя, але па-ранейшаму вельмі важныя».

Працуючы ў выбарчай акрузе, маючы зносіны з насельніцтвам і на пастаяннай аснове вывучаючы асартымент, цэны ў крамах як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці, дэпутат прызнае, што праблемы існуюць. У гэтай сувязі прыводзіць свежы прыклад. Зусім нядаўна ў адным з аграгарадкоў Пухавіцкага раёна, які ў тым ліку ўваходзіць у выбарчую акругу парламентарыя, закрылася крама сістэмы Белкаапсаюза, якая карысталася вялікай папулярнасцю як у мясцовых жыхароў, так і ў дачнікаў, якія з вясны і да позняй восені жывуць на тэрыторыі населенага пункта.

«Крама задавальняла розныя патрэбы насельніцтва і мела вельмі зручнае размяшчэнне ў цэнтры аграгарадка, — канкрэтызавала Алена Пархімчык. — Таксама была магчымасць заказваць пэўныя прадукты ці тавары, у якіх была неабходнасць. Пры гэтым крама прыватнай

### «БУДУЧЫНЯ ГАНДЛЮ Ў СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ — ЗА АЎТАКРАМАМІ»



Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва надае вялікае значэнне павышэнню якасці гандлёвага абслугоўвання, у прыватнасці, у вёсцы. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** нагадала: па даручэнні Прэзідэнта сенатары сумесна з дэпутацкім корпусам з восені 2020 года актыўна ўдзельнічаюць у маніторынгу гандлёвых аб'ектаў, у тым ліку па зваротах грамадзян, якія паступілі падчас асабістых прыёмаў. Сёлета маніторынгам ахоплена амаль 700 гандлёвых аб'ектаў у 75 раёнах краіны, уключаючы 116 сельскіх населеных пунктаў.

Сярод праблемных пытанняў, выяўленых падчас маніторынгу, Наталля Качанава назвала адрозненне цэн на адны і тыя ж тавары ў розных крамах, незахаванне асартыментнага пераліку і закрыццё аб'ектаў з прычыны дэфіцыту кадраў, асабліва ў сельскіх населеных пунктах.

Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на сустрэчы са старшынямі мясцовых Саветаў дэпутатаў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей з удзелам кіраўніцтва Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Белкаапсаюза, якая адбылася ў ліпені гэтага года ў Зэльве. «Вопыт Гродзенскай вобласці па паляпшэнні якасці гандлёвага абслугоўвання насельніцтва паспяховы, — лічыць Наталля Качанава. — Па выніках пасяджэння былі дадзены рэкамендацыі яго выкарыстоўваць у іншых рэгіёнах».

«Будучыня гандлю ў сельскай мясцовасці — за аўтакрамамі, — лічыць спікер. — Таму трэба шукаць механізмы стымулявання сеткавікоў да набыцця сучасных кліентаарыентаваных аўтакрам. Вельмі важна, каб кожны чалавек меў доступ да якасных прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці па разумных коштах, паколькі гэта не толькі ўплывае на ўзровень жыцця, але і служыць асновай для сацыяльнай стабільнасці, з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на павышэнне дабрабыту насельніцтва».

---

ПА СУТНАСЦІ

# ЗАЛАТАЯ ФОРМУЛА СПРАВЯДЛІВАСЦІ



Калектыўны Захад падзяляе, нацкоўвае, разбэшчвае нацыі і дзяржавы і сам паступова вымірае. На глабальным Поўдні — усплёск нараджальнасці. Цяпер існуе нават асаблівае паняцце — «жывыя народы». Гэта этнасы, якія захоўваюць свае культурныя традыцыі і мовы, манеру жыцця.

Дзеля таго каб захаваць сябе ў гісторыі, сакрэт просты: трэба з увагай ставіцца да малых і павагай да сталых. Насамрэч гэта дзейсная і геніяльная формула сацыяльнай дзяржавы. Сацыяльная дзяржава — вялікая раскоша ў сучасным свеце. А калі казаць яшчэ і пра дзяржаву, створаную на прынцыпах справядлівасці, — то гэта ўвогуле выключэнне. Вось да якой вяршыні мы імкнёмся. І дробязяў у гэтым няма.

Ну вось, напрыклад, гандаль. Гэта індыкатар эканомікі, грамадства, дзяржавы. Можна пусціць у вольнае плаванне: маўляў, рынак усё адрэгулюе. А спажывец? Хто выплыве, а хто і не. Капіталізм не прымае лузераў. Ён змяняе нават чалавечыя адносіны: усё мае цану. А вось бясцэннае стаўленне да чалавека, прыкмета сацыяльнай дзяржавы, — рэдкая раскоша. Добра, што Лукашэнка выхадзец не з партыйнай наменклатуры ці новага «гарвардскага істэблішменту». Ён чалавек ад зямлі — ведае і паважае чалавека працы. Што і казаць, у Беларусі неяк не модна выпінаць свой капітал. А каб абараніць гэтую сацыяльнасць краіны, даводзіцца перыядычна прыводзіць у пачуцці схільных да нажывы. На гэты раз у Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі чалавечы твар гандлю. Прычым рэгіянальнага, і асабліва — вясковага.

Вёска насамрэч ажывае. Памятаеце пастулат дзяржаўнай палітыкі: «Захаваем вёску — захаваем краіну». І гэта не толькі глеба для развіцця АПК: харчовая бяспека, дзякуючы знешнепалітычным дамоўленасцям Прэзідэнта — рост экспартных запытаў. Наша вёска — элемент кода беларускасці. Гэта яшчэ і якасць жыцця ў гады ашалелай урбанізацыі. Так, і людзі паехалі абжываць глыбінку. Пачулі заклікі Аляксандра Лукашэнкі і голас розуму ды сэрца. Жыллё сярод прыроды — раскоша для сучаснага чалавека. А ў беларусаў ёсць такая магчымасць — мець

# З КЛОПАТУ ПРА ЧАЛАВЕКА»

**гандлёвага абслугоўвання ў краіне**

## «МЫ НЕ Ў БАКУ АД ГЭТАЙ ПРАБЛЕМЫ»



По завяршэнні выязнога пашыранага пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў, якое адбылося 27 жніўня на базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** звярнуўся да парламентарыяў з просьбай не здымаць з дэпутацкага кантролю пытанні, звязаныя з работай гандлю ў вёсцы.

Напярэдадні спікер прыняў удзел у нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі, якая была прысвечана эфектыўнасці сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў маштабах Беларусі. Гандаль у сельскай мясцовасці заўсёды быў пад пільнай увагай дэпутацкага корпуса. Ігар Сергеенка адзначыў, што напярэдадні нарады ў кіраўніка дзяржавы кожная камісія прадставіла сваё бачанне сітуацыі з улікам меркаванняў і ацэнак выбаршчыкаў. І высновы, якія зрабілі дэпутаты, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, на 100 % карэлявалі з тымі падыходамі, якія на нарадзе агучыў Прэзідэнт.

«Вы чулі задачу, якую дакладна паставіў кіраўнік дзяржавы, — да 1 студзеня распрацаваць эфектыўную сістэму гандлёвага абслугоўвання па ўсёй Беларусі, дайсці да кожнага раёна, — нагадаў дэпутацкаму корпусу спікер. — Задача пастаўлена, вядома ж, кіраўнікам абласцей, раёнаў. Але і мы не ў баку ад гэтай праблемы. У час выездаў у акругі трэба паглядзець, дзе рэальна ёсць пытанні, звязаныя з работай сельскіх магазінаў, спажыўкааперацыі, гандлёвых аб'ектаў іншых форм уласнасці, аўтакрам».

Ігар Сергеенка заклікаў дэпутатаў ставіцца ўважліва да тых праблем, якія да іх паступаюць, у тым ліку, па яго словах, гэта датычыцца пытанняў закрыцця крам, ФАПаў, школ, дзіцячых садкоў у вёсцы. Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на неабходнасць работы ў звязцы з мясцовымі органамі ўлады, пры гэтым глядзець на ўсё сваімі вачамі і рабіць уласныя высновы.

ліку паўплывалі патрабаванні, звязаныя з лічбавізацыяй, на што скіроўваў увагу і Прэзідэнт. У сельскай мясцовасці, як правіла, у гандлі, задзейнічаны людзі перадпенсіённага або пенсіённага ўзросту, якіх палохае ўсё новае».

Дэпутат звярнула ўвагу на тое, што неадназначна ў сельскай мясцовасці ставяцца і да электроннага гандлю. Па яе словах, многія ў сілу свайго ўзросту не разумеюць, як ажыццявіць пакупку ў інтэрнэце. І калі ў летні перыяд гэта праблема часткова здымаецца, бо да пажылых жыхароў прыязджаюць дзеці і ўнукі, то ў іншую пару года электронны гандаль на вёсцы — дакладна не актуальны.

Член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы адзначыла, што ўборачная кампанія — адна з ключавых на парадку дня, але цыкл сельскагаспадарчых работ доўжыцца круглы год. «І, вядома, тыя людзі, якія забяспечваюць харчовую бяспеку краіны, нашы аграрыі, павінны мець магчымасць набываць усё неабходнае ў сваім населеным пункце, — лічыць дэпутат. — Бо, калі ідзе гарачая пара жніва, у іх проста фізічна няма магчымасці кудысьці выязджаць па пакупкі. Гэта датычыцца і збору дзяцей у школу, і набыцця штодзённа неабходных прадуктаў харчавання».

## ЗАДАЧА — СКАРАЦІЦЬ РАЗРЫЎ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ Ў ГОРАДЗЕ І НА ВЁСЦЫ



**Палітолаг Аляксей ДЗЕРМАНТ** у ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» заўважыў, што пытанні, якія датычацца канкрэтных людзей, займаюць такое ж важнае месца ў палітыцы кіраўніка дзяржавы, як і пытанні больш «высокага» ўзроўню:

— Прэзідэнт уважлівы да ўсіх пытанняў, ён арыентуе дзяржаўны апарат адказных людзей на тое, каб гэтымі пытаннямі займацца. Прычым кіраўнік дзяржавы валодае інфармацыяй з розных крыніц, у тым ліку і крытычнай. Бо чыноўнікі і кіраўнікі, бывае, прадстаўляюць некаторыя моманты ў больш выгадным святле, каб не выклікаць крытыку. Дык вось, Прэзідэнт валодае рознай інфармацыяй, таму, калі (у грамадстве. — **Заўв. рэд.**) наспяваюць пэўныя праблемы, ён склікае нараду, каб гэтыя праблемы пазначыць, выслухаць варыянты вырашэння і прызначыць адказных за выкананне.

Аляксей Дзермант адзначыў: трэба пагадзіцца, што ёсць нейкі разрыў паміж якасцю жыцця людзей у сталіцы і рэгіёнах. Задача дзяржавы — скараціць гэты разрыў.

— Калі мы кажам, што ў Мінску дасягальны (да набыцця. — **Заўв. рэд.**) любы пералік тавараў, то і на сяле павінна так быць, — падкрэсліў палітолаг. — Ёсць вельмі небяспечная тэндэнцыя для дзяржавы: калі нібыта праз неэфектыўнасць пачынаюць скарачаць колькасць гандлёвых пунктаў, аўталавак, то-бок узровень даступнасці забеспячэння неабходнымі рэчамі для вяскоўцаў зніжаецца. З'яўляюцца буйныя гандлёвыя сеткі, але да вёскі яны не даходзяць. Гэтыя гандлёвыя сеткі дзейнічаюць у рамках манапалістычнай логікі — зжыраюць усё, што можна, падміналюць пад сябе, але пры гэтым вельмі часта церпіць гэтая даступнасць, якасць жыцця. Таму што буйной сетцы больш выгадна стварыць вялікую краму, каб туды сцякаліся ўсе пакупнікі, чым кропкава развозіць кудысьці прадукцыю і тавары. І гэта праблема. Так, з аднаго боку, мы павінны стымуляваць развіццё бізнесу, гандлю, а з другога — не павінны забываць пра канкрэтных людзей і іх праблемы. У гэтым сэнсе трэба знайсці аптымальны механізм для работы.

Пры гэтым, дадаў Аляксей Дзермант, палітыка Беларусі накіравана на інтарэсы чалавека. Паводле яго слоў, у дзяржаве не думаюць пра тое, як буйному бізнесу атрымаць больш прыбытку з людзей, а, наадварот, вырашаюць праблемы з даступнасцю тавараў і паслуг у сельскай мясцовасці.

— Вядома, ёсць нейкія аб'ектыўныя прычыны закрыцця, напрыклад дэмаграфічныя, але ёсць і суб'ектыўныя, калі хтосьці перастае бачыць для сябе фінансавую перспектыву на вёсцы і закрывае (гандлёвы пункт. — **Заўв. рэд.**) у рамках аптымізацыі, — зрабіў акцэнт Аляксей Дзермант. — Калі людзі пачынаюць пакутаваць праз гэта, павінна ўмешвацца дзяржава. І гэта заўсёды было прыярытэтам нашай палітыкі.

Таму Прэзідэнт і праводзіць падобныя мерапрыемствы, дзе разбірае праблемы канкрэтных людзей, падкрэсліў Аляксей Дзермант. Паводле яго, у гэтым уся сутнасць. Прычым важна разумець, што гэта не ўваходзіць у функцыянальныя абавязкі кіраўніка дзяржавы, для гэтага ёсць іншыя людзі, але ён бачыць праблемы і кажа аб рашэннях.

## ДАСТУПНАСЦЬ ПА РАЗУМНЫХ ЦЭНАХ



На думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандра ГАРОШКІНА**, гандлёвае абслугоўванне насельніцтва — гэта не толькі пытанне даступнасці тавараў і паслуг, але і важны аспект сацыяльнай стабільнасці і якасці жыцця грамадзян:

— Ва ўмовах глабалізацыі і змены спажывецкіх пераваг Беларусь сутыкаецца з неабходнасцю адаптацыі сваёй гандлёвай сістэмы да новых умоў. Прэзідэнт падкрэсліў, што эфектыўная гандлёвая сістэма павінна забяспечваць не толькі шырокі асартымент тавараў, але і іх даступнасць па разумных цэнах.

Сенатар нагадаў, што кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на неабходнасці стварэння ўмоў для роўнага доступу да тавараў для ўсіх грамадзян, а таксама падтрымкі айчынных вытворцаў і фермераў. Ён падкрэсліў, што развіццё мясцовай вытворчасці не толькі спрые эканамічнаму росту, але і забяспечвае насельніцтва якаснымі і свежымі прадуктамі.

— Нарада ў Прэзідэнта стала важным этапам у працэсе рэфармавання сістэмы гандлёвага абслугоўвання. Прынятыя рашэнні і выпрацаваныя рэкамендацыі павінны стаць асновай для далейшых дзеянняў, накіраваных на стварэнне эфектыўнай і даступнай гандлёвай сістэмы, якая спрые паляпшэнню якасці жыцця грамадзян і развіццю эканомікі краіны, — адзначыў суразмоўца. — Важна, каб усе ўдзельнікі працэсу працавалі ў адзіным кірунку, імкнучыся да дасягнення агульнай мэты — дабрабыту і росквіту Беларусі.



уласнасці такой папулярнасцю не карыстаецца. З просьбай захаваць краму Белкаапсаюза людзі прыходзілі да мяне на прыём грамадзян, тэлефанавалі на прамую лінію. На жаль, крама зачынілася. Прадавец пенсіённага ўзросту не пагадзілася працягваць кантракт. На гэта ў тым

сваю хату. Мы нават не можам ацаніць сваё шчасце. Але хацелася б яшчэ і камфорту.

І на ўсё ёсць час для кіраўніка дзяржавы. Ён заняты ў геапалітычных працэсах, актыўны стваральнік стратэгічных інтэграцый, чакаецца візіт у Кітай — на глабальную сустрэчу прэзідэнтаў. Але не забываецца Першы пра спадзяванні ўмоўнай бабы Дуні. Каб ні ў якім разе не пакрыўдзіць яе, Прэзідэнт акрэсліў, якім павінен быць гандаль у вёсцы.

Мы будуем краіну роўных магчымасцяў, і моцныя рэгіёны — прыярытэт пяцігодкі, а Прэзідэнт даручыў выпрацаваць вертыкаль гандлёвага сэрвісу. Ствараць эфектыўную мадэль у рэгіёнах. У райцэнтрах — некалькі добрых гандлёвых цэнтраў, у аграгарадках — меншыя магазіны, у вялікіх вёсках — звычайныя крамы з добрым асартыментам, у невялікіх вёсках — развазны гандаль. Каб нікога не забыць.

Пакуль асноўны гулец на вясковым гандлёвым рынку — Белкаапсаюз. Да яго і прэтэнзіі. Белкаапсаюз — гандаль з сацыяльным тварам. А страты пакрываюць за кошт бюджэту. Толькі на паліва для аўтакрам у гэтым годзе выдзелена Br1,3 млн. З такім падыходам далёка не з'едзем. Прэзідэнт падкрэсліў «цуды» сістэмы спажыўкааперацыі. Пры агульных стратах добра жыве штаб спажывецкай кааперацыі: у кіраўніцтва зарплата вышэйшая, чым у большасці міністраў.

Хата бацькоў — не прадаецца, а з поля зроку Першага ніколі не знікнуць пытанні развіцця беларускай вёскі. Не толькі для рыначнікаў, але і дзяржслужачых скарачэнне сацыяльных аб'ектаў падаецца самым прымальным выйсцем. Павесілі замок, знеслі — ніякай адказнасці. Не, так з Лукашэнкам не атрымаецца.

Пытанне сацыяльнай справядлівасці стала чырвонай ніткай нарады па гандлі. Каб дайсці да кожнага дома і кожнага жыхара, задзейнічаюць розныя рэсурсы. У гэтым працэсе ўсё будзе залежаць ад уцягнутасці мясцовай улады. Гандлёвыя сеткі, прыватнікі і вытворцы павінны будуць падзяліць лагістычны цяжар Белкаапсаюза. Гэта значыць, за кожным удзельнікам гандлёвай прасторы замацуюць тэрыторыі адказнасці. У кіраўнічым штабе Белкаапсаюза зараз рыхтуюцца да канкурэнцыі на іх спрадвечным полі дзейнасці — у сельскім гандлі. Бітву за райцэнтры яны ўжо прайгралі. Але ж ёсць у іх спрадвечная ніша — «прадуктовы хэндмэйд». «Бацькава булка» са Свіслачы, кіраўскія смажанкі, іванаўскія прысмакі, івацэвіцкія саленні...

Сістэму вядома ж выпрацуюць, але калі на вострыя куты не звярнуў увагу Першы, то як бы іх абыходзілі і абыходзілі б увогуле? Гэта як і з коштам тавараў. Да абмеркавання цэн таксама неўзабаве зноў вернуцца.

Рэзюмэ нарады — у заклiку Першага: «не забываць бабу Дуню». Сістэма павінна быць выпрацавана да пачатку будучага года. І тыя, хто сядзіць крукам над паперамі і балансам ведамасных інтарэсаў у высокіх кабінетах, і тыя, хто лічыць капіталы, — павінны не забываць маршчыністыя рукі бабулі з невялікай беларускай вёскі — менавіта яны пабудавалі нашу краіну.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

АДУКАЦЫЯ

# ЯК ПАДРЫХТАВАЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ?

## Акцэнты Мінскага гарадскога адукацыйнага форуму педагагічных работнікаў

Падчас форуму «Сталічная адукацыя: час канструктыўнага ўзаемадзеяння і развіцця» прааналізавана работа сістэмы адукацыі Мінска за мінулы навучальны год, вызначаны прыярытэтныя кірункі ўдасканалення адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, а таксама агучаны задачы на новы вучэбны перыяд.




Фота БелТА.

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** праінфармаваў, што ў Мінску вядзецца вялікая планамерная работа на ўсіх узроўнях устаноў адукацыі. «Размова ідзе не толькі пра абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, увод новых аб'ектаў, але і пра развіццё кадравага патэнцыялу, — канкрэтызаваў ён. — Сёлета больш за тысячу маладых педагогаў прыходзяць у сталічныя школы. Мы лічым, што гэта вельмі важны элемент працы, бо ад таго, які сёння настаўнік прыходзіць у школу, залежыць, якога выпускніка і школьніка мы атрымаем».

Другім немалаважным аспектам, на што звяртаецца ўвага, з'яўляецца развіццё сучасных тэхналогій. «Мы бачым, што профільная адукацыя ў школах Мінска вельмі дынамічна развіваецца, — падкрэсліў Андрэй Іванец.

**— Акрамя таго, што традыцыйна працуюць класы прафесійнай накіраванасці, вельмі вялікую папулярнасць маюць інжынерныя класы. Бачым сёння ініцыятыву Мінска на ўзроўні дапрофільнай адукацыі (гэта 8—9-я класы) па апрабацыі і распрацоўцы новай праграмы, аналагічнай інжынерным класам. Мяркуем, што сёлета яна будзе апрабавана на ўзроўні 9 класа і ў наступным годзе досвед зможам распаўсюдзіць на ўсю краіну. Гэта будзе па-сапраўднаму ранняя прафесійная арыентацыя для нашых хлопцаў і дзяўчат».**

Міністр звярнуў увагу на развіццё сталічных каледжаў. «За апошнія 2-3 гады колькасць месцаў павялічылася на 6,5 тысячы, — канкрэтызаваў ён. — І ў мінулым, і сёлета ў поўным аб'ёме выкананы планы набору, якія маюць павышаную патрэбу. Больш за тое, Міністэрствам адукацыі было дазволена павялічыць лічбы набору на

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# РАЗВІЦЦЁ СЛУЖБЫ РАТАВАННЯ — У СІНХРАНІЗАЦЫІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ

## Пашыранае выязное пасяджэнне Савета Палаты прадстаўнікоў адбылося на базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС



Яго тэма — «Удасканаленне прававога рэгулявання грамадскіх адносін у сферы дзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях». Такі фармат узаемадзеяння дэпутацкага корпуса з прадстаўнікамі ратавальнага ведамства абумоўлены падрыхтоўкай праекта Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях». Мяркуецца, што законапраект будзе разгледжаны ў першым чытанні падчас адкрыцця трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання.

Месца правядзення выязнога пасяджэння было вызначана невыпадкова: навучальная ўстанова з'яўляецца кузняй падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне пажарнай бяспекі, абароны ад надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару. У гэтым пераканаліся і парламентарыі, азнаёміўшыся з вучэбна-матэрыяльнай базай Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, дзе будучыя ратавальнікі праходзяць падрыхтоўку.

### ФІНАНСАВАННЕ З РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І НОВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, работа па ўдасканаленні законаў у сферы дзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях носіць паслядоўны і сістэмны характар. «У 2024 годзе былі зацверджаны абноўленая Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, — нагадаў ён. — У прыватнасці, у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі адным з напрамкаў нейтралізацыі ўнутраных пагроз нацыянальнай бяспецы вызначана далейшае ўдасканаленне дзяржаўнай сістэмы папярэджанняў і ліквідацый надзвычайных сітуацый».

Акрамя таго, у ходзе мінулай сесіі дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў прыняты законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным і мабілізацыйным матэрыяльных рэзервах», які ўступіў у сілу 16 жніўня. Па словах спікера, гэты закон будзе садзейнічаць павышэнню аператыўнасці ў ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый і больш устойлівай дзейнасці вытворчага сектара пры іх узнікненні.

19 чэрвеня Саветам Міністраў у Палату прадстаўнікоў быў унесены праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях». Адно з асноўных новаўвядзенняў — змена парадку фінансавання забеспячэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

«З крыніц іх фінансавання прапануецца з 1 студзеня выключыць абласныя бюджэты і бюджэт горада Мінска, уся нагрузка пры гэтым ляжа на рэспубліканскі бюджэт, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — Гэтая навацыя павінна знайсці адлюстраванне ў Законе «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2026 год». Адпаведным пастаянным камісіям пастаўлена задача праводзіць работу над двума законапраектамі ў цесным звязку.

ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Гэта ўсё сведчыць аб тым, што сувязь рэальнага сектара эканомікі Мінска і ўстаноў прафесійнай адукацыі з'яўляецца вельмі шчыльнай».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў педагагічнага гарадскога адукацыйнага форуму, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** таксама скіравала іх на прафарыентацыйную работу:

> **«Неабходна пабываць на прадпрыемствах, убачыць тое, што ёсць сёння ў нашай краіне, дзе можна прыкласці свой розум, талент і якасці, якія ёсць ад нараджэння, бо кожны чалавек у гэтым жыцці для чагосьці народжаны. Вельмі важна паказаць увесь шырокі спектр таго, што ёсць на рынку працы, каб маладыя людзі дакладна вызначалі патрабаванні да сябе, асабістыя якасці, спецыяльнасць, тое, чым будуць займацца ў далейшым. Гэта абсалютна правільна».**

**Паводле БелТА і прэс-службы Савета Рэспублікі.**

Акрамя таго, прапануецца надзяліць органы дзяржаўнага пажарнага нагляду кампетэнцыяй па ажыццяўленні дзяржаўнага пажарнага нагляду на аб'ектах па вытворчасці і захоўванні выбуховых матэрыялаў. Таксама вызначаецца парадак прымянення работнікамі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях спецыяльных сродкаў.

## У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ПАПЯРЭДЖАННЕ І ПРАФІЛАКТЫКА

Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ**, было прынята рашэнне паказаць прафесію ратавальніка комплексна, паколькі дэпутатам прадстаўлены на разгляд законапраект, які датычыцца дзейнасці ведамства. Па яго словах, на базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС можна ўбачыць, што сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў комплексная, шматузроўневая і практыка-арыентаваная.

Што датычыцца карэкціроўкі заканадаўства, якое мае непасрэднае дачыненне да дзейнасці ратавальнікаў, кіраўнік ведамства падкрэсліў, што ёсць неабходнасць удасканалення і развіцця шэрагу заканадаўчых норм. «Усё гэта ідзе не толькі ў дынаміцы развіцця службы ратавання, але і ў дынаміцы заканадаўчай базы», — канстатаваў Вадзім Сіняўскі і заўважыў, што на разгляд дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ведамства прадставіла законапраект па змяненні чатырох законаў.

Міністр звярнуў увагу на тое, што асноўная дзейнасць МНС накіравана на выратаванне чалавечых жыццяў, аказанне дапамогі людзям, якія церпяць бедствы. «І важнае месца ў гэтым напрамку займаюць пытанні папярэджання і прафілактыкі, — удакладніў ён. — Вельмі важны элемент — навучанне нашых грамадзян, дзяцей пытанням бяспекі жыццядзейнасці, якім мы дастаткова сур'ёзна займаемся».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

УРАЖАННІ

# «МАШТАБНА, ПРЫГОЖА, ІНФАРМАТЫЎНА І ДАСТУПНА»

## 117 супрацоўнікаў ААТ «Гродна Азот» — аднаго з флагманаў хімічнай прамысловасці Беларусі — прыехалі на экскурсію ў Палац Незалежнасці.

Прадпрыемства, якому сёлета спаўняецца 62 гады, іграе важную ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці Гродзенскай вобласці. Сярод гасцей і ветэраны вытворчасці, і маладыя спецыялісты, «ганаровыя хімікі» і супрацоўнікі, удастоеныя розных узнагарод, у тым ліку ўрадавых. Чым уразіла наведвальнікаў экскурсія, даведалася карэспандэнт «Звязды».

Гасцей сустрэлі высокія столі, бляск мармуру і незвычайная светласць зал, у якіх вырашаюцца пытанні дзяржаўнай важнасці. Па асабістым распараджэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі самы вядомы сімвал суверэнітэту і незалежнасці Беларусі ва ўстаноўлены час адкрыты для грамадзян, якія жадаюць дакрануцца да гісторыі і сучаснасці сваёй краіны. Прычым папулярнасць такіх экскурсій расце з кожным годам — наведвальнікі імкнуцца на свае вочы ўбачыць велічныя інтэр'еры Палаца, даведацца пра работу кіраўніка дзяржавы, месца правядзення самітаў і міжнародных сустрэч, зрабіць памятныя фатаграфіі.

Першым уражаннем для ўдзельнікаў экскурсіі стала Зала ўрачыстых цырымоній. Светлая, прасторная, з вокнамі, што адкрываюць від на плошчу Дзяржаўнага сцяга, яна здзіўляе сваёй веліччу: «Я ўпершыню ў Палацы Незалежнасці. Вельмі рада, што наша прадпрыемства дало такую магчымасць. Усё маштабна, прыгожа, вельмі інфарматыўна і даступна», — падзялілася лабарант хімічнага аналізу Кацярына Жамойда. Аказваецца, толькі рэдкасці накшталт мармуру прывезеныя з-за мяжы, у асноўным жа Палац Незалежнасці пабудаваны з беларускіх матэрыялаў мясцовымі майстрамі. Галоўная зала Палаца ўпрыгожана копіяй знакамітага слуцкага пояса — сімвала нацыянальнай культуры і гістарычнай спадчыны. У снежні ў Зале ўрачыстых цырымоній праходзяць дзіцячыя ранішнікі і штогадовы навагодні баль для моладзі.

Зялёная зала Палаца Незалежнасці вядомая, мабыць, ва ўсім свеце. Менавіта тут 11—12 лютага 2015 года прайшла большая частка перагавораў «нармандскай чацвёркі» — прэзідэнтаў Расіі, Украіны, Францыі і канцлера Германіі. У зале працягваюць прымаць прыватныя сустрэчы ў вузкім коле. Яе круглую пландроўку вянчае камін з барочным гадзіннікам. Не меньш знакаміты і яе бакавы пакой, куды лідары «нармандскай чацвёркі» сыходзілі абмяркоўваць самыя далікатныя пытанні. Сёння ж убачыць, дзе былі прыняты рашэнні сусветнага маштабу, жадаюць многія журналісты.

Не менш уражвае Чырвоная зала: cчытаецца імкненне архітэктараў крочыць у нагу з часам, аберагаючы пры гэтым шматвяковыя традыцыі. У гэтым памяшканні часта праходзяць кадравыя дні Прэзідэнта, назначаюцца новыя кіраўнікі, а за масіўным сталом Вялікай залы перагавораў праводзяцца ключавыя нарады ўнутранай палітыкі дня і міжнародныя сустрэчы.

Залу ўручэння дзяржаўных узнагарод часцей называюць проста: зала «Беларусь». Менавіта тут, ва ўрачыстай цішыні і пад успышкі фотакамер, з рук Прэзідэнта атрымліваюць узнагароды тыя, кім ганарыцца краіна. Шматдзетныя маці, ваенныя, вучоныя, спартсмены, дзеячы культуры і мастацтва. Кожны, хто ўваходзіць у гэтую залу, адчувае: тут ушаноўваюць найлепшых. На гэта працуе інтэр'ер: аздабленне з цёмна-зялёнага мармуру, трыццаць дзве калоны ўздоўж сцен, а на іх — выявы дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь:

— Я ўжо быў у Палацы Незалежнасці, але тады, у студэнцкія гады, пабываў не ва ўсіх яго залах, — дзеліцца ўражаннямі Мікіта Нічыпар, майстар участка цэха водазабеспячэння. — Вярнуцца сюды зноў, ужо ў якасці маладога спецыяліста, — асабліва задавальненне. Існуе нават прымета: калі зрабіць фота на памяць у гэтай зале, то ўзрастае шанц самому атрымаць дзяржаўную ўзнагароду. Я таксама зрабіў здымак і цяпер буду старацца апраўдаць чаканні. Дарэчы, ужо ўдзельнічаю ў розных конкурсах, працую на карысць дзяржавы.

Пад шкляным купалам вышынёй 18 метраў адкрываецца цэлы аазіс. Гэта Зімовы сад, уздоўж якога цягнуцца тэрасы з экзатычнымі раслінамі. Іх тут больш за 150 відаў. Увагу гасцей прыцягнуў фантан, аздоблены бронзавымі скульптурамі «Нёман» і «Прыпяць» — дзве ракі, два сімвалы Беларусі. А на трэцім паверсе экскурсантаў сустракае Музей падарункаў — летапіс дыпламатыі ў сотнях экспанатаў. Тут знаходзяцца дары кіраўніку дзяржавы ад лідараў іншых краін, вядомых палітыкаў, дэлегацый, дыпламатаў, спартсменаў, а таксама простых беларусаў і працоўных калектываў краіны. Цікавасць выклікаюць і іншыя лакацыі.

Увогуле, экскурсія падарыла шмат станоўчых эмоцый. Гэта адзначыў і Дзмітрый Самарын, намеснік начальніка аддзела маркетынгу: «Калі казаць шчыра, то уражанні вельмі станоўчыя. Гэта настолькі магутнае і велічнае месца, што часам нават і не знаходзіш слоў, каб апісаць свае ўражанні». І сапраўды: веліч зал, урачыстасць інтэр'ераў пакідаюць цёплы гонар за працу суайчыннікаў — мабыць, адчуванне гэтага выносіць з сабой кожны, хто крочыць па калідорах Палаца Незалежнасці.

**Аміна НАЗАРАВА.**





# УМЕЙ ЛІЧЫЦЬ І ЗБЕРАГАЦЬ

## У Беларусі зацверджаны план дзеянняў па павышэнні фінансавай граматнасці насельніцтва на пяцігодку



**План дзеянняў па павышэнні фінансавай граматнасці насельніцтва на 2025—2030 гады і мерапрыемствы па яго выкананні зацверджаны адпаведнай пастановай Праўлення Нацбанка, паведамілі ў яго прэс-службе.**

Дакумент прыняты для забеспячэння на дзяржаўным узроўні сістэмнай работы па павышэнні фінансавай граматнасці насельніцтва як неабходнай умовы паляпшэння дабрабыту і якасці жыцця грамадзян і ўмацавання фінансавай стабільнасці ў краіне.

Дарэчы, план уяўляе сабой ужо трэцюю шасцігадовую стратэгію павышэння фінансавай граматнасці насельніцтва ў Беларусі. На думку распрацоўшчыкаў, ён дазволіць захаваць і развіць сістэмны характар мер, якія прымаюцца на дзяржаўным узроўні для павышэння фінансавай граматнасці насельніцтва; забяспечыць удзел у рабоце па павышэнні фінансавай граматнасці насельніцтва шырокага кола партнёраў і каардынацыю іх дзеянняў. Дакумент дасць магчымасць пашырыць у рамках сістэмы адукацыі назапашаны вопыт па павышэнні фінансавай граматнасці дзяцей, навучэнцаў і моладзі, а таксама падрыхтаваць кадры ў гэтай сферы. Акрамя таго, дапаможа павялічыць ахоп розных слаёў насельніцтва дзейнасцю па павышэнні фінансавай граматнасці і дасць магчымасць адсочваць дынаміку яе ўзроўню ў краіне, у тым ліку ў разрэзе рэгіёнаў, сацыяльна-дэмаграфічных груп.

Як удакладніў рэгулятар, у рэалізацыі плана будзе задзейнічана шырокае кола дзяржаўных органаў, удзельнікаў фінансавага рынку, а таксама іншых зацікаўленых арганізацый. Каардынацыю работ у рамках плана ажыццяўляе Нацыянальны банк.

У прыватнасці, планам прадугледжваецца правядзенне адміністрацыйных, адукацыйных, асветніцкіх, медыйных мерапрыемстваў і прамой тлумачальнай працы. Пры гэтым прыярытэты будуць зрушаны ў бок лічбавых інструментаў, практыкаарыентаванасці, а таксама адраснасці з улікам спецыфікі кожнай мэтавай групы: навучэнцаў, настаўнікаў, моладзі, якая працуе, грамадзян, пенсіянераў, беспрацоўных і сацыяльна неабароненых груп.

Узаемадзеянне з насельніцтвам працягнецца па такіх тэматычных кірунках, як асабістыя фінансы, базавыя фінансавыя веды, лічбавыя фінансы, падатковая дасведчанасць, страхаванне, абарона правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Акрамя таго, з улікам актуальнасці ў асобны тэматычны блок вылучаны пытанні фінансавай бяспекі і супрацьстаяння кібермахлярству.

Дарэчы, ацэньваць узровень фінансавай граматнасці плануюць на падставе рэспубліканскіх апытанняў, якія будуць праводзіць кожныя два гады: у 2026, 2028 і 2030 гадах.

# КРОК НАСУСТРАЧ АДНО АДНАМУ

## БУТБ будзе супрацоўнічаць з Мазамбікскай таварнай біржай

**Беларуская ўніверсальная таварная біржа (БУТБ) і Мазамбікская таварная біржа (Bolsa de Mercadorias de Mocambique, BMM) аб'ядноўваюць намаганні па развіцці біржавога гандлю паміж Беларуссю і Мазамбікам, паведамілі на біржы.**



Тут адзначылі, што гэта створыць спрыяльныя ўмовы для ўмацавання дзелавых кантактаў паміж суб'ектамі гаспадарання дзвюх краін, адкрые новыя магчымасці для гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і паспрыяе росту ўзаемнага тавараабароту.

Такія стратэгічныя задачы замацаваны ў мемарандуме аб узаемаразуменні, падпісаным старшынёй праўлення БУТБ Аляксандрам Асмалоўскім і старшынёй BMM Вікторыяй Даніэль. Цырымонія падпісання прайшла ў анлайн-рэжыме ў рамках Міжнароднага гандлёвага кірмашу FACIM 2025 у Мапуту — сталіцы Мазамбіка.

— Біржа — дзяржаўная арганізацыя, якая працуе ў інтарэсах эканомікі краіны і якая спрыяе рэалізацыі яе экспартнага патэнцыялу. Таму мы гатовыя ўсталёўваць узаемавыгадныя партнёрскія адносіны з біржавымі пляцоўкамі па ўсім свеце, у тым ліку на афрыканскім кантыненце. Спадзяюся, што падпісаны дакумент стане надзейным падмуркам для будаўніцтва электроннага гандлёвага моста паміж Беларуссю і Мазамбікам, якім будуць актыўна карыстацца прадстаўнікі бізнесу абедзвюх краін, — падкрэсліў кіраўнік БУТБ.

Важнасць такога супрацоўніцтва ў кантэксце развіцця трансгранічнага гандлю адзначыла і кіраўнік BMM. Паводле яе слоў, біржы акумулююць попыт і прапановы, спрашчаючы пошук дзелавых партнёраў, а празрысты механізм цэнаўтварэння дазваляе ў свабоднай канкурэнцыі вызначаць рэальны кошт прадукцыі. У выніку павышаецца эфектыўнасць экспартна-імпартных аперацый, зніжаюцца рызыкі і забяспечваецца бесперашкодны рух тавараў.

— Я не хачу, каб супрацоўніцтва з Беларускай універсальнай таварнай біржай абмежавалася кансультацыямі і абменам інфармацыяй. У першую чаргу яно павінна дапамагчы мазамбікскім кампаніям выйсці на рынак Беларусі для продажу прадукцыі ўласнай вытворчасці і закупкі неабходных ім беларускіх тавараў. Менавіта ў гэтым бачу галоўную мэту нашага партнёрства, — заявіла Вікторыя Даніэль.

Трэба сказаць, што адпраўным пунктам для ўзаемадзеяння БУТБ і BMM стаў Міжнародны Біржавы форум, які адбыўся ў Мінску сёлета, 11 чэрвеня. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі біржаў краін СНД, Азіі і Афрыкі, уключаючы Мазамбік. Дамоўленасць аб супрацоўніцтве паміж беларускай і мазамбікскай пляцоўкамі была дасягнута на палях форуму.

# УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

## У «Вялікім камені» прайшлі перагаворы з адной з найбуйнейшых аўтапрамысловых кампаній Кітая




**Днямі індустрыяльны парк «Вялікі камень» наведала кіраўніцтва і прадстаўнікі кампаніі Chongqing Haite Automobile Exhaust System Co., Ltd (КНР), паведамілі ў адміністрацыі парка.**

Госці падрабязна азнаёміліся з прэферэнцыйным рэжымам індустрыяльнага парка. У час перагавораў бакі абмеркавалі ўмовы рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у «Вялікім камені» і яго перавагі, а таксама льготную палітыку, комплекснае абслугоўванне па прынцыпе «адна станцыя» і пытанні будаўніцтва аб'ектаў.

Адзначым, што кампанія Chongqing Haite Automobile Exhaust System Co., Ltd створана ў 1998 годзе са штаб-кватэрай у Чунцыне. Прадпрыемства ажыццяўляе поўны цыкл вытворчасці каталізатараў, глушыцеляў і сістэм газавай ачысткі для аўтамабіляў. Па аб'ёмах выпуску прадукцыі і продажах кампанія займае лідзіруючыя пазіцыі ў краіне.

# СПРАВА МАЛАДЫХ

## Наладжванне прамых кантактаў адкрывае новыя магчымасці для маладзёжнага прадпрымальніцтва ў Беларусі і Расіі

**Днямі на пляцоўцы гандлёвага прадстаўніцтва Расійскай Федэрацыі ў Беларусі прайшоў круглы стол з удзелам маладых прадпрымальнікаў з Расіі, якія прадстаўляюць кампаніі розных галін эканомікі.**

Як паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі, мерапрыемства было накіравана на ўсталяванне дзелавых кантактаў і выяўленне патэнцыялу беларускага рынку.



У дыскусіі ўдзельнічаў намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Руслан Невяровіч. Ён пазначыў трэнды ў развіцці сектара МСП у Беларусі, расказаў аб мерах, якія прымаюцца дзяржавай для фарміравання спрыяльнага дзелавога клімату, стымулявання прадпрымальніцкай актыўнасці і маштабавання бізнес-ідэй.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца інстытутам падтрымкі прадпрымальніцтва і лічбавым платформам, якія дапамагаюць бізнесу праводзіць маркетынгавыя даследаванні, знаходзіць партнёраў для кааперацыі і распаўсюджваць прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках.

Спікер выказаў упэўненасць, што падобныя ініцыятывы спрыяюць умацаванню гандлёва-эканамічных сувязяў паміж краінамі і адкрываюць новыя магчымасці для маладзёжнага прадпрымальніцтва.

УЗРОВЕНЬ

# ДАХОДЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ АМАЛЬ УДВАЯ

## Эфектыўная эканоміка забяспечвае прыстойныя заробкі



Як адзначыў старшыня камітэта эканомікі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр КАМЕНДАНТ, рэгіён моцна стаіць на нагах, тут працуе каля 250 буйных прамысловых прадпрыемстваў, якія актыўна развіваюцца.

Было падлічана, што эканамічны патэнцыял Гродзеншчыны складае каля 11 % ад усёй эканомікі нашай краіны. Як патлумачыў Аляксандр Камендант, гэты паказчык толькі часткова залежыць ад сельскай гаспадаркі (10 % ад усіх аб'ёмаў), у той жа час адна трэць эканомікі адпавядае прамысловасці. Менавіта таму за 2021—2024 гады рэальныя даходы прадпрыемстваў Гродзеншчыны павялічыліся амаль удвая (196 %). У гэты час рост намінальна налічанай зарплаты адзначыўся тэмпам 190 %.

Па прамысловай вытворчасці рэгіён павялічыў свае паказчыкі амаль на трацiну (133,5 %), у сельскай гаспадарцы — 114 %. За чатыры гады ў вобласці пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю каля 1,9 мільёна квадратных метраў жылля. Прырост рэгіянальнага валавога прадукту да ўзроўню 2020 года складае больш за 13 %. Старшыня камітэта эканомікі лічыць, што гэта годны паказчык.

Маляўнічай візітоўкай вобласці з'яўляецца наяўнасць старадаўніх замкаў і іншых славутасцяў. Гродзенская вобласць рэалізоўвае 25 праектаў у рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект». Па словах Аляксандра Каменданта, многія рэгіёны знайшлі цікавыя нішы, стварыўшы ў сябе новыя вытворчасці і даўшы тым самым стымул для сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў: «Дзесьці гэта турызм, дзесьці — харчовая прадукцыя і гэтак далей. Шэраг праектаў ужо завершаны. Плануецца, што 14 завершацца да канца гэтага года. І ў нас 8 праектаў, якія пераходзяць на наступны год. Гэта вялікія праекты, у рамках якіх нават пабудуюць асобныя прадпрыемствы, якія, пераканаты, унясуць значны ўклад у эканоміку нашай краіны».

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# КАБ ШЛЯХ БЫЎ ЗРУЧНЫМ

## Са сваімі набалелымі пытаннямі на адрас рэдакцыі звярнуліся жыхары г. Лепеля Віцебскай вобласці:

**— Мы пражываем па завулку 2-і Полацкі ўжо не адзін дзясятак гадоў. Пытанне, з якім звяртаемся да вас, хвалюе не толькі нас, а і ўсіх жыхароў вуліцы, а таксама нашых суседзяў , што пражываюць па завулках 1-ы Полацкі і Азёрны. Дарогі ўздоўж названых вуліц не заасфальтаваны. З наступленнем восені, калі пачынаецца перыяд моцных дажджоў, а таксама вясной, калі сыходзіць снег, дарогі ўздоўж нашых вуліц моцна размывае, і без гумавых ботаў па іх прайсці немагчыма. Так, з боку жыллёва-камунальнай службы вядзецца адпаведная работа — ажыццяўляецца падсыпка дарог. Аднак праз пэўны час праблема ўзнікае зноў. Вельмі хацелася б, каб гэта пытанне было ўзята на кантроль.**

**Хвалюе нас і яшчэ адна праблема. Многія жыхары мікрараёна Пясчанка, якія не маюць уласных аўтамабіляў, да цэнтра горада, бальніцы дабіраюцца на рэйсавым аўтобусе. І калі ў будні дні пасля 18 гадзін на гарадскім аўтобусе можна даехаць да бальніцы, то ў выхадныя дні апошні аўтобус адпраўляецца ў 16 гадзін. Для жыхароў мікрараёна, асабліва пажылых людзей, якія жадаюць наведаць сваіх родных у бальніцы, прыезд сюды становіцца праблемай. Вельмі хацелася б, каб рэйс гарадскога аўтобуса ў выхадныя дні быў арганізаваны і ў больш позні час, пасля 18 гадзін.**





Фота носяць ілюстрацыйны характар.

З першым пытаннем нашых чытачоў наконт дрэннай якасці дарог па вуліцах 1-ы, 2-і Полацкі і Азёрны завулкі мы звярнуліся да **Мікалая ЛАТЫШАВА, намесніка старшыні Лепельскага райвыканкама,** які курыруе пытанні будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мікалай Віктаравіч пацвердзіў, што там сапраўды няма асфальту, але пры гэтым адзначыў: «Для падтрымання належнага стану дарог па завулках 1-ы, 2-і Полацкі, а таксама завулка Азёрны рэгулярна праводзіцца іх грэйдзіраванне. Аднак штомесяц праводзіць падсыпку немагчыма...» Намеснік старшыні райвыканкама паабяцаў, што напярэдадні восеньскіх дажджоў спецыялістам жыллёва-камунальнай службы будзе дадзена даручэнне з улікам спецыфікі глебы ў мікрараёне Пясчанка, дзе пражываюць нашы чытачы, дабаўляць у сумесь для падсыпкі дарог даламітавы шчэбень. Гэта дапаможа дарозе пратрымацца ў прымальным стане даўжэй.

***

**Адказ на другое пытанне чытачоў мы атрымалі ў дырэктара ААТ «Аўтатранспартнае прадпрыемства № 14 г. Лепель» Міхаіла КАЗІМІРЧЫКА, які паведаміў наступнае:**

«Так, у будні дні арганізаваны рэйс гарадскога аўтобуса № 5, які дастаўляе пасажыраў да бальніцы. У свой час быў арганізаваны рэйс гэтага ж аўтобуса ў 18 гадзін 22 хвіліны, які рухаўся з аўтавакзала ў напрамку мікрараёна Пясчанка і ў выхадныя дні. Аднак, на вялікі жаль, гэтым рэйсам карысталася мінімальная колькасць пасажыраў, усяго адзін-два чалавекі. Нярэдка людзей не было зусім, таму рэйс адмянілі па прычыне яго немэтазгоднасці».

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**

# У БРЭСЦЕ ПЛАНУЮЦЬ ПАБУДАВАЦЬ ДВА НОВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ

## Новая школа ўжо будуецца



Фота БелТА.

Аб гэтым паведаміў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ. Ён расказаў, што ў сферу адукацыі ў Брэсце накіроўваюць 39 % гарадскога бюджэту. Фінансаванне ідзе на развіццё сеткі ўстаноў адукацыі і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

«Мы за апошнія тры гады больш чым у чатыры разы павялічылі расходы бюджэту на капітальныя і бягучыя рамонты», — адзначыў кіраўнік горада. Ён прывёў у прыклад, што летась быў мадэрнізаваны спартыўны комплекс у сярэдняй школе № 27. Сёлета брэстаўчане змаглі істотна абнавіць яшчэ тры спартыўныя аб'екты: у сярэдніх школах № 9, № 14 і № 26. У гэтым годзе на правядзенне бягучых і капітальных рамонтаў устаноў адукацыі выдзелена больш як Br14 млн. Выкананы работы па добраўпарадкаванні тэрыторый, рамонце спартыўных аб'ектаў, фасадаў будынкаў, памяшканняў і іншае.

«Пачалі пры падтрымцы Брэсцкага аблвыканкама будаўніцтва новай школы на 1020 месцаў. Спадзяюся, што ў наступным годзе да 1 верасня ў нас у горадзе з'явіцца яшчэ адна сучасная ўстанова адукацыі. Плануем пачаць будаўніцтва яшчэ двух дзіцячых садкоў, што ў многім вырашыць пытанні забяспечанасці месцамі ва ўстановах дашкольнай адукацыі», — сказаў Сяргей Лабадзінскі. Кожны з дзіцячых садкоў будзе разлічаны на 190 месцаў. Яны з'явяцца ў мікрараёне Паўднёвы і на вуліцы Лейтэнанта Рабцава.

«У цэлым тое, што неабходна было зрабіць для падрыхтоўкі аб'ектаў адукацыі да новага навучальнага года, зроблена. Праведзена работа па забеспячэнні школ падручнікамі, вучэбна-метадычнымі комплексамі, неабходнай літаратурай, з гарадскога бюджэту выплачана матэрыяльная дапамога на падрыхтоўку сем'яў да новага навучальнага года», — пералічыў старшыня Брэсцкага гарвыканкама.

**Паводле БелТА.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Трест № 15 «Спецстрой»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 29.09.2025.**

**Лот № 1:** К 1/К Здание склада механиков
с инв. № 500/С-27034, 42 кв. м,
г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д, 1, корп. 9
Начальная цена с НДС 20 % – 30 360,00 руб.
Задаток – 6 000,00 руб.

Земельный участок 500000000005003276, 2,9220 га.
Целевое назначение земельного участка: эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений базы управления механизации № 70.
Право постоянного пользования. На земельном участке расположены иные капитальные строения, которые не выставлены на электронные торги. В случае необходимости выделения земельного участка выполнение данных работ относится к обязанности Победителя электронных торгов (Претендента на покупку) с отнесением на него расходов.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Дарэчы, будынак Мажэйкаўскай амбулаторыі, які быў узведзены ў 1870—1880 гадах як флігель сядзібы пана Брахоцкага, з'яўляецца помнікам архітэктуры XIX стагоддзя. Ён ахоўваецца дзяржавай. Гэта пабудова, якая прайшла праз стагоддзі і шматлікія змены, з 1986 года служыла фельчарска-акушэрскім пунктам. Пасля рэструктурызацыі ў 2005 годзе — урачэбная амбулаторыя. Малады ўрач гаворыць, што працаваць у такім незвычайным будынку вельмі цікава.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, фота аўтара.**

## Бліц-апытанне

**Звязаліся з маладымі ўрачамі, якія скончылі Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, каб даведацца, як яны асвоіліся на сваіх працоўных месцах.**



**Выпускнік лячэбнага факультэта Арцём КАПЫЦІЧ у 2022 годзе атрымаў званне найлепшага студэнта СНД, а ў 2023-м стаў найлепшым маладым вучоным СНД:**

— Працую ўрачом-траўматолагам-артапедам у Мінскай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга абласной клінічнай бальніцы, дзе таксама праходжу інтэрнатуру. Разам з калегамі займаемся работай з пацыентамі і афармленнем дакументацыі. Пасля паступлення пацыента ў стацыянар пад кантролем урача-настаўніка праводжу агляд і прызначаю неабходнае лячэнне. Затым асістую настаўніку падчас аперацый. Пасля аперацыі працягваю працаваць з пацыентам да самай яго выпіскі. Такім чынам, я ўдзельнічаю ў лячэнні пацыента на ўсіх этапах. Не абмяжоўваюся працай у сваім аддзяленні. Разам з калегамі выязджаю ў іншыя медыцынскія ўстановы для правядзення кансультацый і аперацый. Цяпер зведваю цэлы спектр эмоцый ад інтэнсіўнай практычнай працы з пацыентамі. Асабліва прыемна было ўпершыню пачуць: «Які ўважлівы малады лекар!» Хачу выказаць падзяку калегам за настаўніцтва — нас не пакідаюць сам-насам з цяжкасцямі, а дапамагаюць, навучаюць і падтрымліваюць.



**Выпускніца медыка-псіхалагічнага факультэта Ксенія ЖЫГАДЛА:**

— Сваю кар'еру я пачала ў Брэсцкім абласным псіханеўралагічным дыспансеры, дзе працую псіхіятрам-нарколагам. Цяпер праходжу інтэрнатуру ў дзіцячым амбулаторным псіхіятрычным аддзяленні. Гэты досвед адкрывае новыя гарызонты прафесійнага росту. Я ўрач-інтэрн на ўчастку, вяду прыём пацыентаў. Штодня ўсведамляю важнасць выбранай прафесіі. Мне пашанцавала працаваць у выдатнай камандзе прафесіяналаў. Настаўнікі і калегі — згуртаваны калектыў, гатовы падтрымаць, растлумачыць і дапамагчы асвоіць новыя навыкі. Такая атмасфера натхняе і матывуе на развіццё.



**Выпускніца лячэбнага факультэта Наталля ТРАЦЦЯКОВА:**

— Размеркавалася ўрачом-хірургам у Гомельскую гарадскую клінічную паліклініку № 14, інтэрнатуру праходжу ў Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. На першым працоўным месцы мяне замацавалі за настаўнікам, пад кіраўніцтвам якога я выконваю розныя маніпуляцыі. Напрыклад, аглядаю пацыентаў, асістую на аперацыях. Таксама ў мяне праходзіць цыкл па амбулаторна-паліклінічнай хірургіі ў Ельскай цэнтральнай раённай бальніцы, дзе пад кіраўніцтвам начальніка медыцынскай службы я прымаю і аглядаю пацыентаў. У першыя дні інтэрнатуры вельмі хвалявалася, але ў выніку ўражанні самыя прыемныя. Мяне добра прынялі і дапамагаюць вырашаць любыя праблемы, адказваюць на пытанні і навучаюць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2025.Ч.002.00209** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебск-Белпромкультура», 210009, г. Витебск, ул. Мира, 11, тел. 8 (0212) 671299.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 26.09.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.**

Капитальное строение с инвентарным номером № 200/С-44969 общей площадью 402,00 кв. м, наименование – склады, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: три навеса по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мира, 11/1.

Капитальное строение с инвентарным номером № 200/С-44977 общей площадью 18,00 кв. м, наименование – трансформаторная, назначение – здание специализированное энергетики по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мира, 11А.

Капитальное строение с инвентарным номером № 200/С-44968 общей площадью 856,00 кв. м, наименование – здание производственных помещений, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: три пристройки и подвал по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мира, 11.

**Нач. цена:** 602 160,00 бел. руб. с учетом НДС.
**Задаток:** 60 216,00 бел. руб.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000001000748 общей площадью 0,2872 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мира, 11 (право постоянного пользования).

Объект продается в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом» по фактическому состоянию: при проведении технической инвентаризации или проверки характеристик недвижимого имущества выявлены признаки самовольного строительства или несоответствия фактического состояния объекта недвижимого имущества данным реестра характеристик (инвентарного дела на объект недвижимого имущества) и отсутствует решение о принятии самовольной постройки в эксплуатацию и ее государственной регистрации в установленном порядке либо решение о согласовании (разрешении) самовольных переустройства и (или) перепланировки жилого помещения, нежилого помещения в жилом доме (возведенный (измененный) в соответствии с законодательством объект недвижимого имущества, его составные элементы или принадлежности расположены за пределами земельного участка, предоставленного для строительства и (или) обслуживания объекта технической инвентаризации).

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** **до 16.00 25.09.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы, связанные с проведением проверки характеристик, изготовление итогового технического документа на объект недвижимого имущества, расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл.торгов в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения эл.торгов и утверждения протокола эл. торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи; получить решение соответствующего исполкома о принятии самовольной постройки в эксплуатацию и ее государственной регистрации в установленном порядке.

*Расходы, связанные с проведением проверки характеристик, изготовление итогового технического документа на объекты недвижимого имущества, составляют 1118,24 бел. руб. с НДС. Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по лоту № 1 составляют 1147,97 бел. руб. с НДС.*

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375298910059, Костенко Сергей Александрович.

Извещения о проведении повторных электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/(№ 32784), Витебского областного исполнительного комитета: https://vitebsk-region.gov.by/.

ПРЫКМЕТЫ ЧАСУ

# КАЛІ ХОЧАЦЦА «ДАБАЎКІ»

**Бады — трэнд апошніх гадоў: добра гэта ці дрэнна?**

Сказаць, што сёння біядабаўкі папулярныя — гэта нічога не сказаць. Яны мегапапулярныя! Беспрэцэдэнтныя тэмпы продажаў бадаў рэгіструюцца па ўсім свеце, і, як прагназуюць эканамісты, у найбліжэйшай будучыні гэты рынак будзе толькі расці. Селебрыці не стамляюцца рэгулярна выкладваць у сацсеткі відэа аб чароўнай сіле вітамінаў, мінералаў і амінакіслот у рознакаляровых капсулах, якія яны прымаюць. Ды і звычайныя грамадзяне не адстаюць, актыўна падтрымліваючы бум на «таблеткі і парашкі» для прыгажосці, здароўя і даўгалецця. Мы спыталі ў нутрыцыёлага, ці сапраўды «працуюць» бады, якія з іх сёння ў модзе і як замест чаканай суперкарысці не нанесці шкоду свайму здароўю.

## ЧАС ЗМЯНЯЕЦЦА — ДЭФІЦЫТ ЗАСТАЕЦЦА

— Вывучэнне ўплыву на чалавечы арганізм вітамінаў і мінералаў пачалося ў 1880 годзе, — адзначае **урач-дыетолаг, рэабілітолаг Марыя ЛІТВІНАВА.** — Працэс ішоў не хутка: клінічныя даследаванні і ў нашы дні патрабуюць даволі шмат часу. Але да 1911 года было даказана, што пэўныя жыццёва неабходныя малекулы і хімічныя злучэнні аказваюць вялікі ўплыў на здароўе і працягласць жыцця чалавека. Дзякуючы такой працы ўдалося звесці на нішто поліненўрыт, рахіт, цынгу — усе названыя эпідэміі былі ад недахопу вітамінаў. Для медыцынскай навукі гэта быў велізарны прагрэс: прафілактыка страшных захворванняў, папярэджанне ранніх смерцяў, рост працягласці жыцця. Так што, біяхімічнае прымяненне БАДаў цалкам апраўдана. Іншая справа, што бескантрольнае ўжыванне біядабавак, якое мы назіраем цяпер, можа быць, скажам так, не карысна для здароўя. Бо доказная база фарміруецца дзесяцігоддзямі.

***— Ці патрэбны БАДы сёння, калі сучаснаму чалавеку даступны разнастайны рацыён харчавання?***

— Тым не менш, у сярэднім прыкладна 80-85 % насельніцтва планеты (і беларусы тут не выключэнне) адчувае дэфіцыт пэўных вітамінаў, мінералаў, іншых актыўных рэчываў. Сапраўды збалансаваны рацыён могуць сабе дазволіць толькі 15-20 %. Прычын шмат: нежаданне «затлумляцца» гэтым пытаннем, недахоп ведаў і часу, «жыццё на бягу»... У выніку пры лішку адных важных рэчываў назіраецца недахоп іншых, не менш неабходных. І яшчэ адзін нюанс. Сёння даказана, што для поўнага задавальнення арганізма ва ўсіх неабходных яму вітамінах і мінералах каларыйнасць рацыёну павінна набліжацца да 3 тыс. ккал у суткі. Такая каларыйнасць непазбежна прывядзе да атлусцення. Так, зараз вітамінаў чалавеку не хапае ў меншай ступені, чым стагоддзі таму. І ўсё ж без «вітамінных комплексаў» нам не абысціся. Асабліва восенню і зімой.



## І ЧАГО ТОЛЬКІ НЕ ХАПАЕ?

***— «Хваробы недахопу актыўных рэчываў» ёсць і ў нашы дні?***

— Так. Тыя ж інфаркты і інсульты, артэрыяльная гіпертэнзія ў шэрагу выпадкаў — вынік дэфіцыту ў арганізме магнію (дадам, што ў нашай краіне прычына больш за 50 % смерцяў — менавіта сардэчна-сасудзістыя захворванні). Недахоп вітамінаў групы B і таго ж магнію прыводзяць да гіперузбуджэння клеткі, і, як следства, да неўрозаў і трывожнасці. Следства недахопу ёду — парушэнні функцыі шчытападобнай залозы, гіпатэрыёз і шэраг іншых паталогій. Недахоп сонца ў нашых шыротах вядзе да недахопу вітаміна D, і толькі дзякуючы таму, што сёння людзі актыўна прымаюць яго ў выглядзе дабавак, а таксама дзяржаўным праграмам па ўзбагачэнні гэтым вітамінам прадуктаў харчавання ў нас невысокі ўзровень рахіту ў дзяцей. Таксама мы эндэмічныя па дэфіцыту селена (гэта магутны антыаксідант), вітамінаў А і Е. Караціноіды можна было б атрымліваць з прадуктаў харчавання, але не ўсе ўключаюць у рацыён на пастаяннай аснове тую ж моркву ці гарбуз, субпрадукты (печань, нyркі, рубец і г. д.).

***— Усё вышэйпералічанае не перашкодзіла б прапіць у бадах?***

— У першую чаргу раю звярнуць увагу на вітамін D, ёд і селен — гэта рэчывы, якіх усім нам не хапае. Курс вітаміна D абавязковы ў асенне-зімовы перыяд. Калі лянуемся ісці здаваць аналізы, каб высветліць дакладную для сябе дозу, то арыентуемся на 1-2 тыс. МЕ для жанчын і 4-5 тыс. МЕ для мужчын у суткі. Для дзяцей, старэйшых за 3 гады — 1 тыс. МЕ. Для нованароджаных дазаванне складае 400-600 МЕ з першага месяца жыцця, але зварот да педыятра абавязковы.

Важна таксама падтрымаць баланс магнію і кальцыю. Калі кальцыю паступае ў арганізм адчувальна больш (а гэта наш выпадак, у нас «малочная краіна»), пры недахопе магнію мы атрымліваем спазмы сасудаў, хуткае фарміраванне атэрасклератычных бляшак, небяспеку ішэмічнай хваробы сэрца. Сімптомы недахопу магнію — арытмія, парушэнні сну, нервознасць. Дазаванне адпаведных прэпаратаў — 10-15 мг на кілаграм вагі ў суткі, то-бок ад 400 мг для дарослага ў дзень. Лепш засвойваецца магнію цытрат (асабліва падыходзіць для гіпертонікаў), малат і таўрат. Гліцынат магнію змяшчае амінакіслату гліцын, таму яго добра прымаць перад сном.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит 03 октября 2025 года в 11.00 открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Сведения об имуществе и его местонахождении, начальная цена.

К отчуждению предлагается имущество ОАО «ДСТ № 3», расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, ул. Кулешова, 17А.

| № | Наименование |
|---|---|
| | **Капитальные строения** |
| 1 | Здание производственного-бытового корпуса, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2861 общей площадью 842,0 кв. м |
| 2 | Здание лабораторного корпуса, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2862 общей площадью 953,0 кв. м |
| 3 | Проходная, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2863 общей площадью 18,0 кв. м |
| 4 | Мазутохранилище 500 т, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2866 общей площадью 220,0 кв. м |
| 5 | Здание столярного цеха капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2869 общей площадью 162,0 кв. м |
| 6 | Здание ремонтной мастерской, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2873 общей площадью 879,0 кв. м |
| 7 | Пристройка к лабораторному корпусу (здание котельной), капитальное строение с инвентарным номером 732/С-3195 общей площадью 15,0 кв. м |
| 8 | Эстакада № 2, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5798 общей площадью 69,0 кв. м |
| 9 | Обменный пункт, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5800 общей площадью 69,0 кв. м |
| 10 | Эстакада № 1, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5801 общей площадью 53,0 кв. м |
| 11 | Площадка для складирования металлолома, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5802 общей площадью 704,0 кв. м |
| 12 | КНС, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5803 общей площадью 4,0 кв. м |
| 13 | Ограждение КНС, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5804 общей площадью 221,0 кв. м |
| 14 | Ограждение, составные части и принадлежности – 2 ограждения, 2 ворот, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5805 |
| 15 | Ограждение площадки складирования, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5806 общей площадью 229,0 кв. м |
| 16 | Сети водопровода, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5811 |
| 17 | Сети тепловые наружные, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5812 |
| 18 | Наружные канализационные сети, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5813 |
| 19 | Здание мазутохранилища, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5818 общей площадью 46,0 кв. м |
| 20 | Очистные сооружения, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5819 |
| 21 | Сети электроснабжения, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5821 |
| 22 | Благоустройство производственной базы, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5834 общей площадью 3444,0 кв. м |
| 23 | Благоустройство лабораторного корпуса, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5901 общей площадью 5306,0 кв. м |
| 24 | Здание автозаправочной станции, капитальное строение с инвентарным номером 732/С-6505 общей площадью 21,8 кв. м |
| | **Зеленые насаждения** |
| 25 | Зеленые насаждения, инв. №683 |
| 26 | Зеленые насаждения, инв. №164 |
| 27 | Зеленые насаждения, инв. № 163 |
| | **Оборудование и ТМЦ** |
| 28 | Стенд плакатов-пособий, инв. № 157 |
| 29 | Топливораздаточная колонка «Нара27М1С», инв. № 822 |
| 30 | Топливораздаточная колонка «Нара27М1С», инв. № 823 |
| 31 | Емкость 25 м$^3$, инв. № 814 |
| 32 | Компрессор ПКС-5.25Д, инв. № 765 |
| 33 | Кран-балка, инв. № 766 |
| 34 | Кран-балка. инв. № 767 |
| 35 | Молот наковальный, инв. № 774 |
| 36 | Емкость 10 м$^3$, инв. № 815 |
| 37 | Емкость 25 м$^3$, инв. № 816 |
| 38 | Емкость 25 м$^3$, инв. № 817 |
| 39 | Емкость 25 м$^3$, инв. № 818 |
| 40 | Емкость, 5 м$^3$, инв. № 819 |
| 41 | Емкость, 5 м$^3$, инв. № 820 |
| 42 | Емкость, 5 м$^3$, инв. № 821 |
| 43 | Наковальня, инв. № 855109 |
| 44 | Склад для хранения нефтепродуктов, инв. № 653 |
| 45 | Шкаф для одежды, 16 шт., инв. № 872007 |
| 46 | Шкаф металлический, 7 шт., инв. № 679 |
| 47 | Шит пожарный закрытый ЩПЭ-С, инв. № 902771 |
| 48 | Электрощит распределитель, 10 шт., инв. № 20210 |
| 49 | Котел стальной водогрейный, инв. № 691 |
| 50 | Котел стальной водогрейный, инв. № 692 |
| 51 | Сети электроснабжения, инв. № 694 |
| 52 | Гелиоводонагревательная установка с солнечным коллектором, иив. № 696 |
| 53 | Стружкоотсос 230В, инв. № 705 |
| 54 | Электроводонагреватель ЭВА-450, инв. № 723 |
| 55 | Емкость для хранения мазута У-200, инв. № 714 |
| 56 | Станок деревообрабатывающий строгальный, инв. № 718 |
| 57 | Станок комбинированный СР-3.01, инв. № 719 |
| 58 | Насосная канализационная станция (насос марки НКФ-54), инв. № 700 |
| 59 | Деревянный навес. инв. № 229 |
| 60 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 3,15(2.2/3000) ПР, инв. № 4250 |
| 61 | Шкаф металлический, 14 шт. инв. № 679 |

Имущество по частям не продается.

Суммарная начальная цена на имущество: 1 508 577,26 бел. руб. без НДС (один миллион пятьсот восемь тысяч пятьсот семьдесят семь рублей двадцать шесть копеек).

Размер задатка: 150 857,73 бел. руб. (сто пятьдесят тысяч восемьсот пятьдесят семь рублей семьдесят три копейки).

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельном участке площадью 2,8116 га с кадастровым номером 723550100001005404 (право постоянного пользования подтверждено свидетельством о государственной регистрации № 732/1949-3331 от 10.07.2024).

Дата, время и место проведения аукциона: **03.10.2025 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **29.09.2025; время: 17.00.**

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

На участие в аукционе к заявлению прилагается:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПЕРАСТАРАЦЦА

***— Прымаць з дзясятак БАДаў адначасова (як сёння робяць многія), напэўна, не трэба?***

— Мы можам сказаць, як засвоіцца адно сінтэтычнае рэчыва. Можам выказаць здагадку, як засвоіцца два рэчывы. Але як засвояцца, дапусцім, шэсць рэчываў, ніхто вам не скажа. Таму ўсё, што пералічана вышэй, п'ём па чарзе, курсамі. У дзеянні вітамінаў, мінералаў, іншых элементаў ёсць сінергізм і антаганізм. Так, калій і натрый — антаганісты, а магній і вітамін В6 — сінергісты, яны ўзмацняюць дзеянне адзін аднаго. Ведаючы гэтыя тонкасці, урач падкажа вам, у які час сутак што лепш ужываць, разам ці асобна. Узмацняюць дзеянне адзін аднаго, дарэчы, таксама жалеза і вітамін С. Больш за тое, жалеза без вітаміну С дрэнна засвоіцца. І жалеза, дарэчы, у нашага насельніцтва таксама дэфіцыт. Мала хто сёння ўжывае ў дастатковай колькасці суцэльнае мяса: сучасныя гаспадыні любяць паўфабрыкаты. Калі замяніць іх у рацыёне суцэльным мясам, то і ў цэлым узровень бялку, і ўзровень ферыціну (гэта бялок, які пераносіць атам жалеза) будзе ў норме. Але памятаем: пасля 40 гадоў лішак чырвонага мяса ў рацыёне можа прывесці да сардэчных паталогій. Аптымальная яго колькасць для сталага ўзросту — 2-3 разы на тыдзень.

***— «Ферыцін» — моднае слоўца ў сацсетках («Я падняла сабе ўзровень ферыціну, можаце мяне павіншаваць!»). Яшчэ адно моднае слова ўжо не першы год — гэта, вядома ж, «амега»...***

— Амега-3,6,9, або поліненасычаныя тлустыя кіслоты, — прадмет шырокіх даследаванняў, якія былі праведзены ў нашай краіне. Пазнай з прадстаўнікамі медыцынскай навукі ў гэтых даследаваннях удзельнічалі таксама вытворцы харчовых прадуктаў. Дык вось, калі спажываць 20 г нерафінаванага рапсавага алею або сумесі алеяў (ільнянога, гарбузовага, гарчычнага, рапсавага і г. д.) у дзень, гэта цалкам забяспечыць патрэбнасць арганізма ў амега-3. Можна дадаць у меню арэхі і двойчы на тыдзень марскую рыбу (неабавязкова дарагую чырвоную — той жа селядзец або скумбрыю). І капсулы амега-3 можна не піць. Таму што, як паказвае практыка, «захапленне» дабаўкамі амега-3 можа стаць прычынай праблем са здароўем. Гаворка ідзе пра вялікія дозы — да 4 г у дзень. У гэтым выпадку поліненасычаныя тлустыя кіслоты могуць правакаваць сардэчна-сасудзістыя паталогіі, выклікаць фібрыляцыю перадсэрдзяў, арытмію і г. д. Так што ў дадзеным выпадку лепш аддаць перавагу замест БАДаў з амегай набыццю рыбы або якаснага алею — таго ж рапсавага, гарчычнага, гарбузовага, ільнянога. Будзе больш карысці.

А ў цэлым, напярэдадні восені і зімы рэкамендацыі такія: шукаем узбагачаныя вітамінамі, ёдам і селенам прадукты, уключаем іх у рацыён. Вітамін D п'ём абавязкова, таму што ён у Беларусі ва ўсіх у лепшым выпадку на ніжняй мяжы нормы. А каб папоўніць астатнія дэфіцыты, прымаем полівітамінныя комплексы.

## ДАРЭЧЫ, ПРА МОДУ

***— Калі ўжо зайшла гаворка пра моду, успомніла яшчэ адзін модны тэрмін — картызол. У Instagram і TikTok тысячы відэа пра тое, як знізіць яго ўзровень. У тым ліку пры дапамозе БАДаў...***

— Картызол — гэта гармон стрэсу. Калі стрэс становіцца хранічным (а гэта звычайная праблема сучаснага чалавека), арганізм выпрацоўвае яго на пастаяннай аснове. Выяўляецца гэта пачашчаным сэрцабіццём, дрэнным сном, панічнымі атакамі, трывожнасцю. Калі ўсё гэта пра вас, такую паломку БАДамі ўжо не выправіць, патрэбна «цяжкая артылерыя» — неўролагі, псіхолагі, псіхатэрапеўты. Ну, а калі паломка яшчэ не адбылася, знізіць узровень картызолу дапамогуць, напрыклад, вітаміны групы В, якія, як правіла, у многіх таксама ў дэфіцыце. Гэта вынік так званай «рафінаванай» дыеты: кашы з хлоп'яў, здоба замест выпечкі з мукі грубага памолу... Прыкметы недахопу вітамінаў групы В — скурныя высыпанні, перхаць, себарэя, ломкасць пазногцяў і валасоў, раздражняльнасць і дрэнны сон. Папоўніце недахоп гэтых вітамінаў, і пералічаныя праявы сыдуць, а таксама знізіцца картызол. Недахоп сну таксама правакуе выпрацоўку картызолу. З парушэннямі сну, як я ўжо казала, эфектыўна спраўляецца магнію гліцынат. А вось прымаць мелатанін я б не раіла. Так, мелатанін (так званы «гармон сну») — антаганіст картызолу.



Але яго натуральную выпрацоўку арганізмам зніжаюць гаджэты. Калі перад сном мы да паўночы «сядзім у тэлефоне» або глядзім серыял, то зніжаем выпрацоўку мелатаніну і, адпаведна, павышаем карцізол. А потым прымаем мелатанін у дадатку. Дзе логіка? Правільней выбудаваць здаровы рэжым сну. Тым больш, не факт, што мелатанін «з капсулы» патрапіць па прызначэнні і забяспечыць вам моцны здаровы сон. Пакуль для такога сцвярджэння няма дастатковай доказнай базы.

***— А што сёлета «ў топе», калі казаць пра біядабаўкі?***

— Ну, напрыклад, 5-гідроксітрыптафан — амінакіслата, якая спрыяе нармалізацыі эмацыянальнага стану. Або альфа-ліпоевая кіслата — антыаксідант, што стымулюе абменныя працэсы. Да нядаўняга часу гэтыя рэчывы не ўжываліся ў якасці біядабавак, толькі ў медыцынскай фармакалогіі. Цяпер выкарыстоўваюцца ў так званых «кропельніцах прыгажосці», якія сёння на піку папулярнасці. «Кропельніцы прыгажосці» — «амаладжальныя», дэтокс, з вітамінамі — шырока даступныя ў санаторыях і медыцынскіх цэнтрах, у тым ліку і па кошце. Гэта модна. Іншая справа, што яны маюць шырокі спектр супрацьпаказанняў, гэта важна ўлічваць.

***— А калі казаць менавіта пра прэпараты, якія можна піць дома?***

— Многія палюбілі пікалінат хрому. Дадатак дазваляе паменшыць цягу да салодкага. Яшчэ адна папулярная дабаўка — клятчатка. І вось пра яе магу сказаць толькі добрае: у рацыёне многіх нашых суайчыннікаў клятчаткі якраз не хапае, пераважаюць вугляводы і тлушчы. Жанчыны часта «прапісваюць сабе» калаген. Але важна памятаць, што засвоіцца ён толькі пры дастатковай колькасці бялка ў рацыёне. Пры недахопе калагену арганізм накіруе яго не на разгладжванне маршчын і здароўе суставаў, а на падтрыманне мышачнай масы. Што таксама нядрэнна, вядома.

А ў цэлым, лепш за ўсё здаць аналізы на вітаміны і мікраэлементы, каб спецыялісты вызначылі дакладныя дозы прэпаратаў, якія вам патрэбныя. Таму што прызначаць самім сабе БАДы, як і лячыцца з дапамогай ChatGPT (яшчэ адзін «модны павеў» трэцяга тысячагоддзя) — на мой погляд, не самая лепшая ідэя.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1, г. Минск, 220004

**Продавец:** ООО «Аквадеус», 220020, г. Минск, ул. Тимирязева, 97, каб. 22-154

| № лота | Предмет аукциона | Кол-во, шт. | Инв. № | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Адрес местонахождения: Минский р-н, д. Боровая, 1, главный корпус, к. 523** | | | |
| 1 | Компьютер в сборе 4 | 1 | - | 1019,04 |
| | Стабилизатор напряжения Ippon AVR-2000 1200Вт 2000ВА 551689 | 1 | 28 | |
| | Мышь беспроводная Logitech M220 Silent Blue, Китай | 2 | - | |
| | Удлинитель бытовой «Люкс» 1,5 м | 1 | - | |
| 2 | Компьютер в сборе 5 | 1 | 30 | 1163,11 |
| | Стабилизатор напряжения Ippon AVR-2000 1200Вт 2000ВА 551689 | 1 | 29 | |
| | Мышь беспроводная Logitech M170 Gray | 1 | 52 | |
| 3 | Компьютер в сборе 1 | 1 | 4 | 741,48 |
| | Источник бесперебойного питания IPPON Back Verso 800, Китай | 1 | - | |
| 4 | Калькулятор наст. 12р. 2 мод. памяти M444 «Deli» черный, пласт., 210*160*40 мм | 1 | 43 | 2137,20 |
| | МФУ лазерное KYOCERA Mita Ecosys M2540dn, Вьетнам | 1 | 2 | |
| | Калькулятор наст. 12р. SDC-444S CITIZEN черный 199*153*30,5 мм | 1 | 20 | |
| | Калькулятор наст. 12р. SDB-1201 CITIZEN черный 200*155*35 мм | 1 | 21 | |
| | Калькулятор наст. 12р. SDB-1201 CITIZEN черный 200*155*35 мм | 1 | 22 | |
| | Калькулятор наст. 12р. SMB-1201BK CITIZEN черный 137*102*31 | 1 | 23 | |
| | Калькулятор наст. 12р. SDB-1201 CITIZEN черный 200*155*35 мм | 1 | 24 | |
| 5 | Ролл ап 2000x850 мм (4+0), (1 компл. – 2 шт.) | 1 | 16 | 245,10 |
| 6 | Рольштора Эден 255* Светло-серый 190x127 (Св.) Мех. Стандарт, L | 1 | 26 | 905,84 |
| 7 | Рольштора Эден 255* Светло-серый 190x127 (Св.) Мех. Стандарт, R | 1 | 27 | 905,84 |
| 8 | Стеллаж паллетный Макстор (комплекс) | 1 | 3 | 93,89 |
| 9 | Конвектор ROYAL CLIMA Ribera Meccanico REC-R1000M (Китай) | 1 | 31 | 128,22 |
| 10 | Конвектор ROYAL CLIMA Ribera Meccanico REC-R2000M (Китай) | 1 | 32 | 149,56 |
| 11 | Вешалка для одежды Signal Gent (белый) | 1 | 33 | 247,85 |
| 12 | Тумба подкатная (416*500*512 мм) | 1 | 35 | 370,51 |
| 13 | Тумба подкатная (416*500*512 мм) | 1 | 38 | 370,51 |
| 14 | Кресло офисное EVERPROF EP-696 хром сетка серая, механизм качания | 1 | 39 | 228,88 |
| 15 | Кресло офисное EVERPROF EP-696 хром сетка серая, механизм качания | 1 | 40 | 228,88 |
| 16 | Ящик для инструментов пласт. 320x185x152 | 1 | 46 | 17,04 |
| 17 | Шлифмашина углов. Werker Ag 750 (750 Вт, 125 мм, 12000 об./мин., кор.) | 1 | 48 | 101,09 |
| 18 | Кофеварка KITFORT KT-7105-3 черно-бирюзовая (Китай) | 1 | 53 | 216,60 |
| 19 | Локальная вычислительная сеть | 1 | 8 | 825,59 |
| 20 | Кресло офисное EVERPROF ER-896 хром, сетка серая, механизм качания | 2 | - | 370,09 |
| 21 | Стол тип М36 | 1 | - | 145,74 |
| 22 | Тумба подкатная тип 1 (416*500*512 мм) | 1 | - | 38,87 |
| 23 | Стол тип М36 | 1 | - | 145,74 |
| 24 | Тумба подкатная тип 1 (416*500*512 мм) | 1 | - | 38,87 |
| 25 | Кресло офисное EVERPROF ER-896 хром сетка серая, механизм качания | 2 | - | 370,09 |
| 26 | 0,8 м подводка д/смесит. AZARIO LUXe (силик. оболочка) ПАРА (60 шт. в кор.), О-585 от 09.01.24 | 2 | - | 2404,21 |
| | 1,0 м подводка д/смесит. AZARIO LUXe (силик. оболочка) ПАРА (50 шт. в кор.), О-585 от 09.01.24 | 1 | - | |
| | 1,2 м подводка д/смесит. AZARIO LUXe (силик. оболочка) ПАРА (40 шт. в кор.), О-585 от 09.01.24 | 1 | - | |
| | А31 Водослив для умывальника 5/4" с нержавеющей решеткой 63, 1117365 от 28.09.23 | 49 | - | |
| | А31 Водослив для умывальника 5/4" с нержавеющей решеткой 63, 1117376 от 02.10.23 | 20 | - | |
| | AZ-2179-S Раковина накладная. Размер 350*350*110 мм, О-56139 от 29.05.23 | 1 | - | |
| | AZ-7050DMB Раковина накладная 415*415*135 мм черная, О-43347 от 25.04.23 | 2 | - | |
| | AZ-78326MB Раковина накладная черный матовый. Размер 600*415*135 мм, О-43347 от 25.04.23 | 2 | - | |
| | Умывальник «Бриз-60» 1/отв, О-78570 от 17.07.23 | 1 | - | |
| | Стенд металлический для раковин под стиральную машину (литье) | 1 | - | |
| | Стенд для душевых ограждений 950x950 (нового образца) | 1 | - | |
| | Стенд «Смесители +200» 900*500*2200 | 1 | - | |
| | Т-образный (двухсторонний) стенд для санфаянса со съемной крышкой 1400x1380x1300 (без роликов) | 2 | - | |
| | Стенд УН 8 (стенд на 8 раковин) | 1 | - | |
| 27 | Стенд под кнопки Loranto | 1 | - | 472,06 |
| | Сет LORANTO Инсталляция с кнопкой Line хром глянец + унитаз CANTO с сиденьем микролифт | 1 | - | |
| | Стенд для подвесного унитаза | 1 | - | |
| 28 | AZARIO зеркало Капитан D510 мм коричн. кожа | 1 | - | 171,76 |
| 29 | AZARIO зеркало Alone Raggio влагостойкое с подсветкой 1000*700 | 1 | - | 145,82 |
| 30 | Fretta new PP Унитаз напольный безободковый в комплекте с бачком и сиденьем микролифт, полипропилен | 1 | - | 324,77 |
| 31 | AZARIO зеркало Classico Quadrato влагостойкое с подсветкой 800*600 | 1 | - | 131,14 |

**Шаг торгов: 5 % от начальной цены предмета аукциона**

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **29.09.2025** в 13.00 по адресу: **ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1, г. Минск, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **26.09.2025** до 17.00 по адресу: **ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1, г. Минск, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни по предварительному согласованию, тел. +375 44 589-59-85

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) календарных дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) календарных дней со дня проведения аукциона

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов и **вознаграждение** 10 % от цены продажи лота возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# МЯДОВА-ЯБЛЫЧНЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ



**Па гарызанталі: 1.** З мёдам і ... — маліна (прык.). 14 жніўня — мядова-макавы Спас. **4.** Яблык — ... вечнай маладосці (прык.). 19 жніўня адзначаюць Яблычны Спас. **10.** Не корм пчалу корміць, а гаспадарчае ... (прык.). **11.** Калі ... добрым бывае, мёд у вуллях прыбывае (прык.). **12.** Распаўсюджаны на Беларусі сорт позніх яблыкаў. **13.** Хвойнае дрэва. 15. Дзе цвяток, там і ... (прык.). **16.** Спадзявайся ... на мёд, ды не еўшы спаць лёг (прык.). **20.** Прывядзенне ў рабочы стан. **21.** Яблыкі, якія апалі ад ветру. **24.** Стыль спартыўнага плавання. **25.** Прылада для акуравання пчол дымам. **27.** Тое, што і даенне. **31.** «Калі хочаш доўга жыць і зберагчы ..., абавязкова еш мёд». Авіцэна. **32.** Урачысты верш. **33.** Засеянае поле. **34.** Крывое ..., ды яблыкі салодкія (прык.). **35.** Скарочанае абазначэнне слова «гектар».

**Па вертыкалі: 2.** Перакрыцце праёма ў сцяне. **3.** Вялікія нажніцы. **5.** Драпежны пушны звярок сямейства куніцавых. **6.** Дарожка ў парку. **7.** «Яблыняў белая ... // Вабіла чысцінёй». З верша Д. Пятровіча «Белая квецень каханняя». **8.** Дарадчы орган пры патрыярху. **9.** «Мой мядок, мой ...» З беларускай народнай песні «Зазвінела пчолачка». **14.** «Марозікам пахне ..., // Жаўрукова́ю песняй — яблык». З верша Я. Сіпакова «Пра стол». **17.** Метэорны дождж. **18.** З вачэй ... сыплюцца, а з языка мёд цячэ (прык.). **19.** Будзе ... на кветцы — будзе і яблык на стале (прык.). **22.** Назва познеасення сорту яблыкаў беларускай селекцыі. **23.** Адгара або мёд п'е, або ... трэ (прык.). **26.** Тое, што ўрач. **28.** Той, хто косіць траву, збажыну. **29.** Задавальненне. **30.** Заплаканы ... і пчолы джаляць (прык.).

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 1.** Каліна. **4.** Сімвал. **10.** Вока. **11.** Лета. **12.** Антонаўка. **13.** Елка. **15.** Мядок. **16.** Дзед. **20.** Пуск. **21.** Апад. **24.** Брас. **25.** Дымар. **27.** Удой. **31.** Маладосць. **32.** Ода. **33.** Ніва. **34.** Дрэўца. **35.** Га.

**Па вертыкалі: 2.** Арка. **3.** Ножны. **5.** Ілька. **6.** Алея. **7.** Кведзень. **8.** Сінод. **9.** Саладок. **14.** Капуста. **17.** Зарапад. **18.** Іскры. **19.** Пчала. **22.** Сябрына. **23.** Кайданы. **26.** Медык. **28.** Касец. **29.** Уцеха. **30.** Твар.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 221**

Завяршыўся міжнародны конкурс складання да 65-годдзя беларускага шахматнага кампазітара Аляксандра Сымановіча. Паступіла 47 задач ад 30 аўтараў з 8 краін. Суддзя-юбіляр адзначыў 29 твораў.

**Раздзел задач ад 13 да 24 фігур**

**Прызы:** 1) Яўген і Валерый Кірылавы (Расія); 2) Валерый Шавырын (Расія); 3-4) Аляксандр Панкрацьеў (Расія); 3-4) Мірaслаў Світэк (Чэхія); 5) Міхаіл Храмцэвіч, Віктар Волчак (Беларусь); 6) Золтан Лабаі (Славакія); спецпрыз — Ігар Агапаў, Аляксандр Шпакоўскі (Расія).

**Пачэсныя водгукі:** 1) Мікалай Бықаў, Міхаіл Мароз (Беларусь); 2) А. Панкрацьеў; 3) Юрый Гарбаценка (Расія), Леанід Макаронец (Ізраіль); 4) Луіс Эчэмендзія (Куба); 5) Генадзь Мацюшын (Расія); спецыяльны — Мікіта Краўцоў, Аляксандр Сыгураў (Расія).

**Пахвальныя водгукі:** 1) М. Храмцэвіч; 2) Эльмар Абдулаеў (Азербайджан); 3) Л. Макаронец, Леанід Любашэўскі (Ізраіль); 4) Відадзі Заманаў (Азербайджан), В. Волчак; 5) А. Панкрацьеў; 6) В. Заманаў, В. Волчак.

**Раздзел задач да 12 фігур**

**Спецпрыз** — Юрый Аляксееў (Расія).

**Пачэсныя водгукі:** 1) Віктар Жук (Беларусь); 2) М. Світэк; 3) Г. Мацюшын.

**Пахвальныя водгукі:** 1) З. Лабаі; 2) Э. Абдулаеў; 3) Аляксей Азаў (Беларусь); 4) Юрый Анціпін (Расія); 5) Даніэле Гаці (Італія).

**Спецпрыз за выяўленчую задачу** з ініцыяламі юбіляра — Вадзім Жылко (Беларусь).

* * *

Прапануем чытачам задачу Г. Мацюшына са згаданага конкурсу **(гл. дыяграму).**



Белыя: Kpd5, Фd3, Ca5, Kc2, пп. b3, c3 (6).

Чорныя: Kpb2, па2 (2).

Мат за 3 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску адбыўся традыцыйны міжнародны турнір. Сёлета ён сабраў 199 гульцоў (127 з Беларусі, 22 з Расіі, 47 пад сцягам FIDE, па 1 з Польшчы, Ірландыі і Казахстана). Сярод удзельнікаў было 7 гросмайстраў, 8 міжнародных майстроў, 12 майстроў FIDE (улічваючы жаночыя званні).

1-2 месцы падзялілі беларусы — гросмайстар Дзяніс Лазавік і міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі. У іх па 8 балаў з 10. Па 7,5 бала набралі міжнародныя майстры Арцём Стрыбук (Беларусь; трэцяе месца), Максім Самусенка (Расія), гросмайстры Яўген Левін (Расія), Міхаіл Нікіценка, Аляксей Аляксандраў, міжнародны майстар Максім Царук, майстар FIDE Міхаіл Спіжарны, Радзівон Сідарэня (усе — Беларусь), міжнародны майстар Дзмітрый Кушко (Ірландыя). Сярод жанчын найлепшыя вынікі паказалі майстры FIDE Алёна Гармаш (Расія; 16-е месца), Аляксандра Тарасенка (Беларусь; 18-е) і Юлія Лявонава (Беларусь; 21-е).

* * *

На наступны дзень адбыўся бліцтурнір, прысвечаны Міжнароднаму дню шахмат (166 удзельнікаў). Прызавую тройку склалі Міхей Навуменка, Сяргей Жыгалка (абодва — Беларусь) і Максім Тураў (Расія). Найлепшай з жанчын была Аляксандра Тарасенка.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Фd5! (не вядзе да мэты 1. Kpc7? Kpf7! або 1. Фc4? Kpd8!). Правільна адказалі Леанід Шацько, Мікалай Гайба, Сяргей Сувееў, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО**

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 756 мм рт.сл. | +15..+17°C | +23..+26°C |
| ВІЦЕБСК | 757 мм рт.сл. | +13..+15°C | +23..+26°C |
| МАГІЛЁЎ | 759 мм рт.сл. | +14..+15°C | +25..+27°C |
| ГОМЕЛЬ | 760 мм рт.сл. | +15..+17°C | +26..+27°C |
| ГРОДНА | 753 мм рт.сл. | +18..+19°C | +25..+27°C |
| БРЭСТ | 755 мм рт.сл. | +17..+19°C | +27..+29°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік 23.08.–30.08. Месяц у сузор'і Скарпіёна .*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

МАСКВА +18..+21°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +14..+16°C



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 28 ЖНІЎНЯ Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1905** год — нарадзіўся Фёдар Іванавіч Дарашэвіч (г. Камянец Брэсцкай вобл.), беларускі мастак. У 1938 г. скончыў Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна ў Ленінградзе. З 1951 г. жыў у Мінску. У 1960—1966 гг. выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Аўтар станковых твораў «Пасля працы», «Гарманіст ідзе», «Трывога», лірычных пейзажаў, шэрагу партрэтаў.

**1920** год — нарадзіўся Барыс Васільевіч Бандарэнка, беларускі вучоны, кандыдат тэхнічных навук (1952 г.). Адзін з першых у Беларусі выкарыстоўваў ЭВМ пры інтэрпрэтацыі геафізічных даных. Аўтар навуковых работ па структурнай геафізіцы, тэктоніцы, сістэмным аналізе, абгрунтаванні нафтаноснасці і метаданоснасці нетраў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978 г.).

**1925** год — нарадзіўся Георгій Раманавіч Мартынаў (г. Іванава, Расія), артыст балета, заслужаны артыст Беларусі (1955 г.). З 1952-га — саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, з 1963-га — балетмайстар Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, у 1967—1975 гг. — саліст балета Беларускай філармоніі. Выконваў пераважна партыі характэрнага плана.

**У свеце**

**1850** год — з англійскага паравога буксіра «Галіяф» праз праліў Па-дэ-Кале ўпершыню ў свеце пракладзены марскі тэлеграфны кабель.

**1895** год — нарадзіўся Мікалай Сяргеевіч Шацкі, расійскі геолаг, адзін з заснавальнікаў вучэння аб геалагічных фармацыях, акадэмік АН СССР (1953 г.). Пад яго кіраўніцтвам упершыню складзены тэктанічныя карты СССР і Еўразіі. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1958 г.).

**1925** год — нарадзіўся Аркадзь Натанавіч Стругацкі, расійскі пісьменнік. У суаўтарстве з братам Барысам Стругацкім напісаў шэраг навукова-фантастычных твораў, якія сталі класікай жанру («Цяжка быць богам», «Панядзелак пачынаецца ў суботу», «Пікнік на абочыне» і іншыя).

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 461. Індэкс 63850. Зак. № 1786.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12